



# Летапіс
# ТБШ



**Інфармацыйна-метадычны часопіс**
**Рэспубліканскага грамадскага аб’яднання**
**«Таварыства беларускай школы»**

# Летапіс
# ТБШ

**№ 2 (25), 2011**

У нумары

***Афіцыйна***

VIII справаздачна-выбарная Асамблея РГА “ТБШ” і нацыянальная канферэнцыя “Пострэформавы стан беларускай адукацыі” ....................................2

***Алесь ЛОЗКА***. Гэта ўжо не проста катастрофа ў адукацыі, а гвалт над будучыняй беларусаў ............................................................................ 3

***Тамара МАЦКЕВІЧ***. Праблемы адукацыі вачыма настаўніка.................... 8

Пастанова Асамблеі ТБШ і Нацыянальнай канферэнцыі .......................... 11

План мерапрыемстваў у сістэме Міністэрства адукацыі па папулярызацыі і пашырэнні сферы выкарыстання беларускай мовы ў жыцці грамадства на 2010 і наступныя гады ........................................................................... 14

***Педагагічны дзёньнік***

Сьцісла і сьціпла ............................................................................................ 18

Сказанулі ......................................................................................................... 20

***Асьвета і культура***

***Алесь ЛОЗКА***. Ніл Гілевіч: “Не траццё веры і мужнасці, сябры!” .................. 21

***Лявон БАРШЧЭЎСКІ***. Уладзіміру Коласу – 60 .......................................... 25

Энгельсу Дарашэвічу – 70 ............................................................................. 29

***Любоў ІЛЬЯСАВА***. Інтэрактыўныя элементы ў дзіцячых экскурсіях ............ 29

Марк Бругеман гаворыць па-беларуску ........................................................ 31

На каляровай вокладцы ................................................................................. 32

*Збор усіх нумароў часопіса “Летапіс ТБШ” можна знайсці ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі (220114 Мінск, пр. Незалежнасці, 116; тэл. +375-017-2903737; http://nlb.by), Навукова-педагагічнай бібліятэцы Міністэрства адукацыі РБ (220088 Мінск, вул. Захарава, 59; тэл. +375-017-2941965; e-mail: biblio@unibel.by) і рэдактара (+375-017-895698), апошні нумар часопіса выстаўляецца ў чытальнай зале грамадскай літаратуры Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (тэл. +375-017-2841492, 2841475; http://libcat.bas-net.by).*

*Афіцыйна*

# VIII справаздачна-выбарная асамблея РГА “ТБШ” і нацыянальная канферэнцыя



У Мінску 24 верасня адбылася VIII справаздачна-выбарная асамблея Рэспубліканскага грамадскага аб’яднання “Таварыства беларускай школы” і нацыянальная канферэнцыя “Пострэформавы стан беларускай адукацыі”. У іх прынялі ўдзел педагогі і бацькі дзяцей з розных адукацыйных устаноў Беларусі. Асноўны даклад зрабіў старшыня РГА “ТБШ” Алесь Лозка *(далей друкуецца)*. Трывожныя ноткі ў стане адукацыі гучалі ў выступленнях Віталя Гарановіч з Глыбокага, Аляксея Пяткевіча і Таццяны Канопкінай з Гародні, Лявона Анацькі з Ліды, Зміцера Салаўёва з Магілёва, Вінцука Вячоркі, Тамары Мацкевіч, Аляксея Рагулі, Пятра Садоўскага, Алеся Сядзякі з Мінска і інш.

Кіраўнікамі аб’яднання былі абраны Алесь Лозка (старшыня), Тамара Мацкевіч і Алесь Сядзяка (намеснікі), а таксама канцылярыя, метадычная і рэвізійная камісіі. У раду ТБШ увайшлі Яўген Адамовіч, Лявон Баршчэўскі, Уладзімір Дзіско, Аляксандр Казулін, Аляксей Рагуля, Арсень Ліс (Мінск); Рэгіна Сімакова (Брэст), Таццяна Канопкіна і Аляксей Пяткевіч (Гародня), Анатоль Крупа і Галіна Альшэўская (Лідчына), Зміцер Салаўёў (Магілёў).

Былі прыняты адпаведныя пастановы *(далей друкуецца)*.

*Алесь ЛОЗКА,*
*старшыня ТБШ*

# ГЭТА ЎЖО НЕ ПРОСТА КАТАСТРОФА Ў АДУКАЦЫІ, А ГВАЛТ НАД БУДУЧЫНЯЙ БЕЛАРУСАЎ

Раней любілі цытаваць словы Леніна пра ролю і аўтарытэт настаўніка, якія ён будзе мець пры новай уладзе, нібы чаго не меў у царскай Расіі. Словы пралетарскага дыктатара і цяпер выяўляюць злобадзённасць і актуальнасць. Асабліва на адлегласці бачыцца рэальны стан спраў, можна даць больш аб'ектыўную адзнаку якасці адносін грамадства да педагога, стан развіцця нацыянальнай адукацыі. Але ўжо адразу можна заключыць, што яна не на карысць аўтарытэту сучаснага педагога.

За тыя грошы, што атрымліваў з дзяржаўнай казны дарэвалюцыйны настаўнік, можна было не толькі добра сталавацца і мець жыллё, але і яшчэ наняць прыслугу, купляць кнігі і падарожнічаць і, галоўнае, яго паважалі, яму зайздросцілі, перад ім здымалі шапку. А за казённыя грошы інспектара народных вучылішч Ільіч Ульянаў, бацька Аляксандра-царазабойцы, не толькі бязбедна пражываў, але і ўтрымліваў яшчэ аднаго амбіцыйнага і патрабавальнага да сябе апазіцыянера, які любіў адпачываць заможна як за кардонам, так і ў ссылцы, вольна ходячы з ружжом па шушанскіх лясах, пастрэльваючы рабчыкаў і зайцаў, або слухаючы ў цішы "Месяцавую санату" за піянінам, прыцягнутым з дому за тысячы вёрст па бездаражы. Параўнайце з цяперашнім палітычна асуджаным на "хіміі" ці ў вязніцы.

Паслядоўнікі Леніна не здольны былі за семдзесят гадоў здзейсніць трызненні таварыша, яшчэ больш ідэалагічна закабаліўшы савецкага педагога, змушаючы яго да вывучэння навуковага камунізму і выратавання калгаснага лагеру шляхам усяшкольнай уборкі бульбы і забора ў сялян малака і гэтаму падобных гвалтаў.

У незалежнай Беларусі прыхільнікі калгасна-савецкай сістэмы паспяхова працягнулі справу разбурэння нацыянальнай адукацыі і згубы аўтарытэту настаўніка. Якім жа чынам гэта здзяйснялася і куды ідзе беларуская школа?

У мінулым навучальным годзе ў Беларусі працавала 3 584 установы з дзённай формай навучання дзяржаўнай формы ўласнасці, якія забяспечваюць атрыманне агульнай сярэдняй адукацыі (на 72 установы менш, чым у папярэднім годзе)[1], з якіх па адной установе знаходзяцца ў міністэрствах сацзабеспячэння, культуры, абароны, нацбанка і па надзвычайных сітуацыях. Акрамя таго працуе 9 агульнаадукацыйных устаноў прыватнай формы ўласнасці, дзе навучалася толькі 558 вучняў. У дзяржустановах было 952 682 вучні. Па сутнасці вось толькі такую інфармацыю можна дастаць з афіцыйных крыніц. Ды тое больш чым

[1] Тут і далей інфармацыя з міністэрскага сайта

гадовай даўніны і нічога пра беларускамоўны складнік адукацыі.

Пасля таго, як грамадскасці сталі вядомы планы кіраўніцтва рэспублікі аб рэвізіі школьных праграм у 2007 годзе, з якіх былі выкінуты многія нацыянальна значныя творы беларускай літаратуры і ўзняўся шум у грамадстве, была звольнена група работнікаў адукацыі разам з міністэрскім інспектрам Тамарай Саўчук па сутнасці за ўцечку інфармацыі, затым была і засакрэчана ўсякая інфармацыя пра беларускамоўныя класы і школы, змяншэнне якіх працягваецца. Цяпер мы толькі можам успамінаць ранейшыя лічбы: у 1993-94 навучальным годзе ў першыя беларускамоўныя класы прымалася 76 адсоткаў ад усіх дзяцей, а ў Мінскай вобласці нават 92,6. Вядома толькі, што ў 2008-09 гг. прымалася 16,7% дзяцей у класы з беларускай мовай навучання. Усяго навучаецца па-беларуску недзе менш 20%.

Праўда, у афіцыйнай справаздачы міністэрства ў раздзеле “Дашкольная адукацыя” знайшлося трохі месца аб мовах выхавання: “У 17 774 групах адукацыйны працэс здзяйсняўся на рускай мове, 3 368 групах – на беларускай, 3 групах – на польскай (Брэсцкая і Гродненская вобласці), 1 групе – на літоўскай (Гродненская вобласць). Самая вялікая колькасць груп, у якіх адукацыйны працэс здзяйсняўся на беларускай мове, у Мінскай вобласці – 941 група (14 тыс. дзяцей), што складае 31% ад іх агульнага ліку, найменшая колькасць – 154 групы (каля 3 тыс. дзяцей) у г. Мінску, г.зн. 3,9 % ад іх агульнага ліку”. Выяўляецца, што ў ДДУ стан беларускамоўнай адукацыі вышэйшы, чым у школах і наступным годзе, калі будзе забяспечана пераемнасць, Беларусь чакае небывалы рост беларускамоўных першакласнікаў.

Вясковыя школы, якія яшчэ ў савецкі перыяд былі роднамоўнымі, пад living рознымі прычынамі русіфікуюцца, дзеці з малакамплектных установ пераводзяцца чыноўнікамі агулам у больш буйныя, але з рускай мовай навучання. Дзякуючы нацыянальнаму руху грамадскасці ўдаецца ўтрымліваць у сталіцы асобныя гімназіі з беларускай мовай навучання (4, 9, 14, 23, 28). Недзе ў двух дзесятках сярэдніх установ трымаюцца ў Мінску класы з беларускай мовай навучання. Новыя беларускія школы не адкрываюцца. Апошнім часам змены адбыліся ў некаторых гарадах, дзе адчыніліся пасля доўгага перапынку беларускія класы і групы ў дашкольных установах (Гродна, Брэст, Магілёў, Ліда, Ашмяны, Смаргонь, Баранавічы і інш.). Прозвішчы асобных самаахвярных бацькоў у гэтай барацьбе сталі вядомы на ўсю краіну: у Гродне сям’я прафесара Алеся Астроўскага распачала новую хвалю беларускіх класаў, а ў Магілёве адчынена беларуская група дзякуючы сем’ям Зміцера Салаўёва і Аляксея Бацюкова, у Горках каторы год мужна трымаецца сям’я Віктара Каралькова, у Жодзіне – Алеся Лапіцкага.

Сярэдняя і вышэйшая школа – гэта лакмусавая паперка грамадзянскасці, дзе ярка выяўляецца спад і зняпад, развіццё і росквіт чалавечай думкі і грамадзянскай актыўнасці. З аднаго боку навучальныя ўстановы былі ў розныя

перыяды ідэалагічнай падпоркай таталітарных рэжымаў, з другога – урадлівай глебай талентаў і барацьбітоў за перадавое, што рухалі грамадства ўперад. Паглядзіце: у шэрагах палітыкаў – большасць педагогі. Колькі прадстаўнікоў адукацыйных устаноў (асабліва студэнтаў і выкладчыкаў) было звольнена ў нас па палітычных матывах. Перад актыўна-грамадскай асенняй парой педагогі разам з іншымі атрымаюць па 500 тысяч рублёў, а студэнты ў Мінску – бясплатны праезд. Гэта таксама можна назваць часовай заваёвай.

Аднак ужо многае ў нас зроблена, каб прынізіць аўтарытэт і прэстыж настаўніцкай працы. Ва ўстанове педагога завалілі паперкамі, якія трэба пісаць і адпісваць, яго вымусілі заглядваць у халадзільнікі вучняў, не будучы калгаснікам працаваць у калгасе, сядзець у выбарчых камісіях, выпэцкваючы падазрэннем у падтасоўках вынікаў. І прытым аднеслі настаўніка разам з культработнікам у самыя нізкааплатныя катэгорыі. Яго з лёгкасцю звальняюць са школы і не мае значэння вага інтэлектуальнага багажу і майстэрства, як гэта здарылася з Наллей Ільініч (Пухаўшчына), Андрэем Аляхновічам (Крупкі), Аляксандрам Казулінам (Мінск) і інш.

На кіруючыя пасады прызначаюцца не заўсёды лепшыя, а тыя, што могуць прыстасавацца, выслужыцца перад начальствам, найлепш выканаць яго загад. Процьма кіраўнікоў, што не толькі не валодаюць дзяржаўнай мовы, але і працуюць не па спецыяльнасці. Не мала выпадкаў, калі нават ва ўстанову з беларускай мовай навучання прызначаецца дырэктар, які не толькі з'яўляецца прыкладам у выкарыстанні роднай мовы, але і зусім яе не ведае (СШ № 60 г.Мінска, БГЛ імя Якуба Коласа і шмат іншых). Ды што дырэктар? Вось прэм'ер-міністр Анатоль Тозік заявіў, што ніводзін з 332 супрацоўнікаў апарата Савета міністраў не валодае вольна замежнымі мовамі. А праверку ведання дзяржаўных моў у нас не прынята праводзіць.

Яўную дыскрымінацыю педагог адчувае, калі афармляецца на пенсію. Розным чыноўнікам, работнікам сілавых структур памер пенсіі налічваецца ў памеры 70 – 75 % ад сярэдняй зарплаты, астатнім у памеры 40 – 45, а для настаўніка прыдумана з 2009 г. асобная "ганаровая" ніша – толькі 30 %. Акрамя таго, з 2008 г. выкладчыкам ВНУ зніжаны аклады і даплаты за вучонае званне і ступень.

Адукацыя для сённяшняй улады – месца для штогадовай эканоміі сродкаў. Раней у законе "Аб адукацыі" быў закладзены нарматыў - не менш 10% ад ВУП. Аднак на самай справе ён увесь час скарачаецца: у 2001 г. было запланавана зрасходаваць 6,5%, у 2009 – 4,5%. Ва ўсіх нашых суседзяў (Малдова, Украіна, Азербайджан і інш.) на адукацыю выдаткоўваецца ў два разы больш сродкаў. Беларускім універсітэтам сістэматычна даводзіцца план тэмпаў росту па платных паслугах.

Пра так званую школьную рэформу мы ўжо раней адзначалі, што гэта таксама выцягненне сродкаў з адукацыі. Мы згубілі тут

профільнасць, паглыбленасць, варыятыўнасць у навучанні, выцяснілі эстэтычны і гуманістычны накірунак (у параўнанні з суседзямі значна скарацілася музычнае выхаванне, маляванне, знік прадмет “Айчынная і сусветная культура”). Нават чыноўнікі Міністэрства культуры выказваюцца за вяртанне прадмета ў школу. Давялося пасля ўзмацняць замежныя мовы, гэтым выказаўшы памылковасць паспешнай і непрадуманай рэформы.

Беларусь – адзіная краіна ў Еўропе, што не ўступіла ў Балонскі працэс. Ёсць небяспека ў тым, што нашы чыноўнікі ўбачаць ў ім толькі тое, дзе можна з’эканоміць (скараціць тэрмін навучання).

Са шкадаваннем можна канстатаваць, што і ў прынятым Адукацыйным кодэксе не адлюстраваны нацыянальныя і еўрапейскія педагагічныя ідэалы, няма скіраванасці на грамадзянскае выхаванне праз нацыянальна-патрыятычны складнік.

Вучэбныя планы ўніверсітэтаў дагэтуль перагружаны абавязковымі прадметамі з грамадска-палітычнай сферы. Цяпер нават гуманітарыі вывучаюць вышэйшую матэматыку, якую ўвёў міністр-матэматык.

Агульны крызіс у адукацыі, яе катастрафічны стан, асабліва стаў праяўляцца ў апошнія гады. І пра гэта пачынаюць гаварыць і чыноўнікі ад адукацыі. Самыя нізкія балы на цэнтралізаваным тэсціраванні выяўляюць абітурыенты па матэматыцы і фізіцы (21,56 і 18,6 адпаведна). 70 % абітурыентаў, што здавалі фізіку, набралі менш 20 балаў. Два гады запар у БДУ і БДПУ недабор на бюджэтныя месцы па гэтых прадметах. У 2009 годзе дырэктар Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў Мікалай Фяськоў папярэджваў, што ў апошнія гады агульны ўзровень падрыхтоўкі выпускнікоў СШ падае. Даводзіцца спрашчаць заданні цэнтралізаванага тэсціравання. Ужо тады 1,7% абітурыентаў не набіралі ні аднаго бала на іспытах па матэматыцы. Засталіся не запоўненымі ў ВНУ і ССНУ 435 бюджэтных месц. У 2010 годзе на фізфак БДУ на 50 бюджэтных месц было пададзена толькі дзве заявы.

Асабліва вялікую трывогу выяўляюць вынікі набора ў асноўную кузню педагагічных кадраў. Яшчэ ў мінулым годзе рэктар БДПУ Пятро Кухарчык у газеце “Звязда” заяўляў: “Сярэдні бал дыктоўкі па дзесяцібальнай сістэме склаў па рускай мове 2,8 бала і па беларускай – 4,3 бала… Кідалася ў вочы неадпаведнасць балаў школьнага атэстата, сертыфіката і дыктоўкі… Абітурыенты з нізкімі баламі ў сертыфікатах (2, 3, 4, 5, і 6 балаў) змаглі стаць нашымі студэнтамі…”. І што было зроблена?! Сёлета конкурса зусім не было на дзённыя бюджэтныя аддзяленні на пяці спецыяльнасцях: “Фізіка. Матэматыка”, “Фізіка. Інфарматыка”, “Фізіка. Тэхнічная творчасць”, “Беларуская мова і літаратура”, “Нямецкая мова. Беларуская мова і літаратура. Руская мова і літаратура”. Стануць вучыцца на педагога-фізіка і матэматыка абітурыенты, якія свой прадмет амаль не ведаюць (71-80 і 122 балы адпаведна). На дзённым платным аддзяленні яшчэ больш шакіруючыя вынікі. Тут конкурс быў толькі па чатырох спецыяльнасцях. Прымалі

ўсіх, хто здаў экзамены, на многае закрывалі вочы

У БДПУ ўжо праведзены кантрольныя работы сярод першакурснікаў, якія пацвердзілі поўны крызіс у адукацыі. Напрыклад, на гістарычным факультэце сярэдняя адзнака па дыктоўцы 1,7 бала па 10 бальнай сістэме, а на самым прэстыжным, псіхалагічным, дзе штогод бывае самы вялікі конкурс, 1,2 балы. У цэлым па ўніверсітэце на "нездавальняюча" напісалі рускую дыктоўку 48% першакурснікаў і беларускую 49,1 %. З матэматыкай не справіліся 43%, а фізікі – зусім 94%. Вывад універсітэцкіх педагогаў – палова першакурснікаў не могуць стаць паўнавартаснымі настаўнікамі. І галоўныя вынікі адлюстроўваюць палітыку ўлады да прафесіі педагога.

У 2010 г. Міністэрства адукацыі, не выканаўшы ранейшы, прыняла чарговы план мерапрыемстваў па пашырэнні сферы выкарыстання беларускай мовы ў жыцці грамадства на 2010 і наступныя гады *(далей друкуецца)*. Не думайце, што ён нейкім чынам закране начальніка, яго вялікасць чванства і непрыступнасці.

Маецца яшчэ адна важная асаблівасць, на якую амаль не звяртаюць у нас увагу. Беларусь ніколі не зможа зраўняцца ў патэнцыяле адукацыі з тымі краінамі, дзе здзяйсняецца 12-гадовае і аднамоўнае навучанне. Увёўшы ў сістэму адукацыі двухмоўе 15 гадоў таму назад, мы ўзвалілі на свае плечы пакутны цяжар палітычных і эканамічных праблем. Тая вялікая колькасць гадзін у кожным класе, якая ідзе на вывучэнне двух блізкароднасных моў, у іншых краінах размяркоўваецца на родную і замежныя мовы, матэматыку і іншыя прадметы. Вось для чаго яшчэ спатрэбілася недальнавідным дзяржаўным мужам засакрэчваць інфармацыю пра паступовае задушэнне душы пакутнага народа, закладваючы пад будучыняй беларусаў міну запаволенага дзеяння, на абяшкоджанне якой спатрэбяцца дзесяцігоддзі.

*Дзейнасць ТБШ.*

VII асамблея прайшла 23 мая 2008 года.

Выпушчана 23 нумары часопіса "Летапіс ТБШ". Штогод ад аднаго да чатырох нумароў. За справаздачны перыяд – 5.

Ганаравана дыпломамі ТБШ 517 чалавек. За тры апошнія гады – 245. Сярод іх 31 удзельнік конкурса адукацыйных матэрыялаў (ноутбук) у 2008 г., 38 у 2009 г., 42 у 2011 г.; пераможцы "Беларускага пяціборства"; выкладчыкі і навучэнцы зачыненага ліцэя; прадстаўнікі замежжа, якія спрыяюць бел. навучанню і інш.

Асноўныя мерапрыемствы:

- Асамблея "Беларускамоўнае навучанне і выхаванне: нацыянальная бяспека і незалежнасць краіны" у 2008 годзе.
- Конкурс дашкольнікаў "Нашчадкі Скарыны". 2008 г.
- Распрацоўка праграм па раёназнаўству. Надрукавана – 14.
- Конкурс "Прыватная сядзіба – асветна-культурны цэнтр".
- Каляднае віншаванне педагогаў сталічных беларускамоўных устаноў – 5

гімназій і школы, трох – дашкольных. 2009 г.

- Арганізацыя паездкі творчых калектываў на міжнародны конкурс Interfolk у Францыю (“Неруш” БДУ, 2009 г.; “Рудабельскія гарэзы” Акцябрскага раёна, 2011 г.).
- Семінар на новых тэхналогіях навучання ў Стаўбцоўскім раёне.
- Штогадовы конкурс “Беларускі настаўнік” (Ніна Трэгубава, г.Лунінец; Юры Мянькоў, Кармянскі р.; Валеры Тухта, Лепельскі р. – 2008 г.; Мікола Жуковіч, г.Бяроза; Лявон Баршчэўскі, г.Мінск; Ігар Пракаповіч, г.Паставы – 2009 г.; Марына Кандраціна, Стаўбцоўскі р.; Алесь Язвінскі, г.Нясвіж; Анатоль Сініла, Бярэзінскі р. – 2010 г.).
- Конкурс адукацыйных выданняў. 2009 г.
- Стварэнне вучэбных электронных дапаможнікаў.
- Распаўсюджанне кнігі Алеся Клышкі “Мінская зямля”.

Патрабуе асобнай гаворкі работа ЧТПК “Еўрапейская школа XXI ст.” ТБШ, якой кіруе У.Колас, Л.Баршчэўскі і І.Сідарэнка. Сёлета зачынены ліцэй знайшоў прапіску ў Гданьску.

Актывізуюць дзейнасць Гарадзенскае, Горацкае, Брэсцкае, Лідскае аддзяленні ТБШ, што маюць рэгістрацыі ў адпаведных райвыканкамах. Працуе добра нямала суполак, якія такую рэгістрацыю атрымаць не могуць.

*Тамара МАЦКЕВІЧ,*
*ТБШ*

## ПРАБЛЕМЫ АДУКАЦЫІ ВАЧЫМА НАСТАЎНІКА

17 сакавіка 2010 года газета “Звязда” надрукавала ліст настаўніка з Віцебшчыны “Самаадданасць педагога нельга эксплуатаваць бясконца” (Артыкул можна знайсці па спасылцы http://www.zviazda.by/ru/archive/article.php?id=55145&idate=2010-03-17). Журналісты звярнуліся да настаўнікаў, каб тыя дасылалі ў рэдакцыю свае пытанні, агучвалі праблемы школы. Рэдакцыя абяцала перадаць усе пытанні і прапановы ў Міністэрства адукацыі і надрукаваць адказ.

Артыкул збіраў і збірае водгукі настаўнікаў больш за паўтара года. Ужо настаўнікі даслалі 326 лістоў. Рэдакцыя перадала гэтыя водгукі ў міністэрства адукацыі, каб яно адрэагавала на праблемы школы і настаўніка, але рэакцыі не дачакалася.

Я паспрабавала сістэматызаваць сказанае ў каментарах, што думаюць самі настаўнікі пра стан адукацыі. Некаторыя высновы ілюструюцца цытатамі з настаўніцкіх лістоў на мове арыгінала. Вось што атрымалася.

**Праблемы, пазначаныя настаўнікамі ў каментарах:**

- нізкі заробак і як следства фемінізацыя школы;
- шмат папераў;

- прыпіскі (існуе ціск начальства пры выстаўленні адзнак, каб школа добра выглядала);
- паборы (суботнікі, у дадатак адлічэнне дзённага заробку ў фонд суботніка, падпіскі на “Юный спасатель”, “Советскую Белоруссию”, “Настаўніцкую газету”, зараблянне школай грошай…);
- навязванне планавага задання па платных паслугах;
- хамства адміністрацыі; дырэктары і начальнікі запалохваюць, пагражаюць; любімы выраз “вплоть до увольнения без права восстановления”;
- малая ўвага адукацыйнай функцыі ў школе (“дырэктар ператварыўся ў гаспадарніка, які павінен займацца найперш вырашэннем фінансава-гаспадарчых пытанняў, а не арганізацыяй адукацыйнага працэсу ў школе”)**;**
- вялікая колькасць і пагардлівае стаўленне правяраючых інспекцый;
- абавязковыя шматлікія конкурсы, праекты і г.д.;
- адсутнасць абароны (сапраўдных прафсаюзаў);
- выкананне ненастаўніцкай працы (дзяжурствы на дыскатэках, “всеобуч”, праца з сацыяльна-небяспечнымі сем'ямі, дагляд іх дзяцей, рамонт школы, спагнанне грошай з бацькоў, праца на прышкольных участках і ў калгасах, выбары - зверка спісаў, стаянне ў пікетах);
- жытло (“аграгарадкі пабудавалі для п'яніцаў-даярак, настаўнік, які працуе ў аграгарадках не можа прэтэндаваць на жытло”);
- непрынянцце новых падыходаў.

**Настроі:**

- нявера ў змены;
- любоў да прафесіі;
- пачуццё прыніжанасці;
- страх перад бучыняй.

Вось некалькі цытатаў у пацвярджэнне:

“І не папракайце, калі ласка, мяне ў маладушнасці і непрынцыповасці, бо на нязгодных заўсёды знаходзіцца ўправа (ды яшчэ якая!). За сябе ўжо не баюся, аднак у школе вучацца мае дзеці”.

“Шкада, што ўся намі тут напісаная праўда нікому непатрэбна. За месяц з лішнім, што цягнецца данная дыскусія, ... ніхто нават не паспрабаваў праверыць праўдзівасць інфармацыі. А яна на 100% (нават 200%) праўдзівая!!! "Вы сабе пішыце - нікому гэта ваша праўда непатрэбна".

"Прочитал почти все высказывания. К кому мы обращаемся? ... Поэтому, все эти действительно "крики души", только для нас - учителей".

“ Только наплевать всем высокосидящим на это. Как было, так и останется. Придумают еще кучу конкурсов и бумаг, чтобы не было времени в Интернете сидеть и образование наше порочить”.

“Дзякуй "Звяздзе" хаця б за прадстаўленую магчымасць выпусціць пару, якая скапілася ўжо за колькі гадоў”.

“Вспомните, как обошлись с профильным обучением. Зимой все на педсоветах восхваляли и пропагандировали его, отчитываясь о результатах и мониторингах, а весной объявили вредным и нерезультативным”.

**Хто вінаваты**

Кіраўніцтва(чыноўнікі).

“На мой погляд, як раз тут "сабака і закапаная". Нашым

кіраўнікам, відаць, зручна, калі настаўнік будзе так загружаны, што і галавы падняць не здолее. Тады з яго вяроўкі віць можна, а калі паабяцаць грашовую падачку ці пару адгулаў, дык ён і зорку з неба дастане...”

“Сколько нам ожидать..., чтобы уровень образования упал настолько, чтобы чиновники, наконец, признали, что "у нас в образовании существуют некоторые проблемы?”.

Самі настаўнікі

“Тут то мы пишем, изливаем душу, но своё настоящее имя не называем. Вот где зарыта собака”.

“Ліст, які я чытаю ўверсе, увесь прасякнуты сутнасцю, прабачце, раба. Дзе і калі Вы так пачалі папускацца, што і не заўважылі, як імі сталі...”

Сістэма

“Всё дело в том, что школа – это зеркало общества”.

“Кто не хотел прогибаться под систему, того уволили, или сам ушёл. остаются только пенсионеры, которым уже деваться некуда, молодые, которых силой распределили и те, которые равнодушно относятся к тому, чем они занимаются”.

“Да, мы не подписываемся. Любого из нас любой чиновник в порошок сотрёт, если узнает, и причину найдёт очень просто – несоблюдение какой-нибудь инструкции”.

“Учитель - продукт общества. Наивно звучит, что учителя сами виноваты в своем положении. В такое уж положение нас поставили. Перефразируя слова известной песни группы "Кино"”: "Умные, храбрые, да сильные все погибли в школе, в бою...". Сколько замечательных учителей, чувствуя, что они борются с ветряными мельницами, что они не нужны обществу, ушли и уходят из школ. А вы предлагаете оставить нас наедине со своими проблемами”.

**Шляхі вырашэння**

- Барацьба памяркоўнымі метадамі (негвалтоўны супраціў).
- Нельга маўчаць: трэба падаваць скаргі ў суд, пракуратуру...
- Кансалідацыя.
- Вывучаць паспяховы досвед іншых педагогаў.
- Пачынаць з сябе: заняць уласную пазіцыю (у першую чаргу маральную).
- Звальняцца.
- Уносіць прапановы Міністэрству адукацыі.

“Впрочем, ничто ведь вам всем не мешает с этим бороться – хотя бы нашими памяркоуными методами. На все кандидатуры, выдвигаемые в профлидеры – против. Голосовать за 18-20% премии – и вы увидите, что уважения к вам прибавится сразу. Можно сказать, в разы.”

“Лепш маўчалівае супраціўленне, чым стагнаць на форумах і кухнях!”

“И правильно здесь многие говорят – нельзя молчать. Есть суд, прокуратура, можно писать жалобы начальникам на их самих же. И показав что на шею сесть на даешься, и трогать тогда больше не будут, не будут мешать работать, не будут издеваться …”

“Я 17 лет отработала в городской школе, но проблемы знакомые. Вот уже 2 года работаю в иной сфере, и только теперь почувствовала себя человеком”.

“Так вот – раба в себе сначала подавить надо, а потом уж глобально проблему решать.... А знаете что – а давайте пригласим коллег (может, есть ещё смелые) рассказать свои победительные истории работы в школе. Наверняка же есть такие! Ребята, не бойтесь вы – никто вам ничего не сделает, просто расскажите, как удалось остановить чиновнический произвол на местах цивилизованно и убедительно. Может, кому-то пригодится, и тогда "вопящих в пустыне" меньше станет.

“Мы пишем, бедствуем, жалуемся, но беда в том, что мы себе ни в чём помочь не можем, ни нам помочь не могут. Всё возвращается на круги своя. Все пишущие говорят правду, которая никому не нужна”.

“Наверное, пора все высказанное на форуме и написанное в газете, представить официально Министерству образования и ЦК профсоюзов образования и науки. Приглашать на круглый стол учителей и просить высказаться о правдивости написанного, нереально, у человека сработает чувство самосохранения”.

“Наблюдатель написал "для нас сейчас главное – это консолидация. Еесли мы будем сейчас в одиночку сражаться каждый в своей школе против всей этой системы, то нас просто переломают по одному как спички”.

“Мушу заўважыць: у пэўным сэнсе нас ужо зламала гэтая самая сістэма. І цяпер казаць пра кансалідацыю зарана – не саспела сітуацыя”.

“Праблема больш глабальная, чым яна падаецца асобным настаўнікам. Створаная пачварна-бюракратычная сістэма разбурае этычны падмурак, на якім мусіць базавацца сфера адукацыі. Яна штораз прапануе настаўніку зрабіць маральны выбар далёка не лепшага гатунку. Падаваць тую бязглуздую справаздачу альбо не падаваць, падпісвацца на газеты, што навязваюцца, альбо не падпісвацца, здаваць кожны веснавы месяц грошы ў фонд суботніка альбо не здаваць... І настаўнік ідзе супраць сумлення – робіць тое, што хоча сістэма (і яе прадстаўнікі!). Падставовы маральны іммунітэт страчаны, яго заступіў “рэфлекс” самазахавання. Дзеля яго мы ўжо гатовыя здрадзіць усяму, нават святому. Загадаюць нам перавесці выкладанне з роднай мовы на расійскую – моўчкі пагадзімся. Скажуць, дык супраць закону не папрэш, так схацелі бацькі вучняў. Яно ж так, на жаль. Але, дзе наша ўласная пазіцыя?”.

## ПАСТАНОВА

### Асамблеі ТБШ і Нацыянальнай канферэнцыі «Пострэформавы стан беларускай адукацыі»

**Прааналізаваўшы стан навучання і выхавання ў перыяд так званай школьнай рэформы, Асамблея Таварыства беларускай школы і ўдзельнікі Нацыянальнай канферэнцыі канстатуюць глыбокі крызіс, які вядзе беларускую адукацыю да немінучай катастрофы.**

*Перадумовы крызісу наступныя:*

- Рэформа адукацыі праводзіцца паспешліва, у якасці асноўнага абраны памылковы прынцып “выроўнівання” коштам профільнасці, паглыбленасці, варыятыўнасці вучэбных праграмаў, павышэння ролі замежных моваў, развіцця эстэтычнага і гуманістычнага кірункаў.
- Нестабільнасць нарматыўнага забеспячэння вучэбнага працэсу, частая змена асноўных дакументаў вядзе да зрыву рытму навучання, бюракратызуе працу і выклікае псіхалагічную перагрузку педагогаў.
- Ігнараванне праблем школьніц-тва, скарачэнне бюджэтных сродкаў на адукацыю, стаўленне да педагога як да ідэалагічнага прыдатку дзяржавы, аднясенне ў разрад нізкааплатных прыводзіць да страты аўтарытэту настаўніка ў грамадстве, падрывае прэстыж прафесіі.
- Раўнанне на савецкую школу, занядбанне еўрапейскіх і нацыянальных адукацыйных ідэалаў, традыцыяў і набыткаў, штучнае стрымліванне развіцця сеткі школаў з беларускай мовай навучання і грамадзянскага выхавання на аснове нацыянальна-патрыятычнага складніка не дае школе мачгымасці адпавядаць выклікам часу праз узгадаванне адказных, кампетэнтных, сучасна адукаваных і патрыятычна настроеных грамадзянаў. Гэта непазбежна вядзе да напружання ў грамадстве, да палітычнай і эканамічнай нестабільнасці, да масавай эміграцыі моладзі.
- Недалучэнне да Балонскага працэсу і непрыняцце еўрапейскіх стандартаў у адукацыі спараджае недавер да айчыннага навучання, псуе імідж краіны за мяжою.

*Крызісны стан беларускай адукацыі характарызуецца наступнымі чыннікамі:*

- крытычна нізкі ўзровень агульнай падрыхтаванасці выпус-кнікоў (ва ўніверсітэты, у тым ліку педагагічнага цыклу, прымаюцца абітурыенты з нездавальняльнымі паказчыкамі элементарнай арфагра-фічнай і матэматычнай адукаванасці, што асабліва недапушчальна для будучага настаўніка-спецыяліста);
- у апошнія гады ў ВНУ застаецца шмат незапоўненых месцаў як на платныя, так і на бюджэтныя месцы, асабліва па спецыяльнасцях педагагічнага кірунку; пераважная большасць выпускнікоў педагагічных універсітэтаў не жадае працаваць па размеркаванні; школу пакідаюць найлепшыя спецыялісты, мужчыны-педагогі;
- працоўная дзейнасць у адукацыйных установах неспра-вядліва аднесеная да нізкааплатных катэгорыяў; няма сістэмнасці ў вызначэнні акладаў, даплатаў і прэміяў; дыскрымінацыйнае стаў-ленне да педагагічнай працы выяўляецца ў налічэнні пенсіі (так, дзяржаўным чыноўнікам і службоўцам сілавых структураў пенсія налічваецца ў памеры 70 – 75% ад сярэдняга заробку, астатнім – 45%, а педагогу – 30%);
- педагог адукацыйнай установы (ад дашкольнай да вышэйшай) загружаны папяровай працай, ад яго патрабуюць дадатковай прымусовай працы ў выбарчых кампаніях, гаспадарчых ды іншых

работах, далёкіх ад ягоных прафесійных абавязкаў, а часта і перакананняў;

- да педагогаў прымаюцца грубыя меры ідэалагічнага прымусу ў форме маральных і адміністрацыйных уздзеянняў і пакаранняў; нават лепшых студэнтаў, настаўнікаў і выкладчыкаў звальняюць за грамадскую і палітычную дзейнасьць, якая ажыцццяўляецца ў непрацоўны і невучэбны час, пераследуюць судом, штрафамі, зняволеннем;
- штогод нямала творчых і навукова падрыхтаваных людзей пакідаюць Радзіму, шукаючы самарэалізацыі за мяжою; гвалтам зачыняюцца і выцясняюцца за мяжу цэлыя ўстановы з еўрапейскімі традыцыямі (Еўрапейскі гуманітарны ўніверсітэт – у Вільню, Беларускі гуманітарны ліцэй – у Гданьск);
- пад скарачэнне патрапляюць найперш культура- і нацыятворчыя дысцыпліны гуманістычнага і эстэтычнага профілю (музыка, выяўленчае мастацтва, гісторыя Беларусі, этнафальклорны комплекс; "Беларусазнаўства", "Айчынная і сусветная культура"), якія ў адукацыйнай сістэме іншых краінаў маюць ключавыя пазіцыі;
- ігнаруюцца метадычныя патрэбы беларускамоўных школаў, а менавіта не выпускаюцца ў тэрмін па-беларуску дапаможнікі, атласы, працоўныя сшыткі, матэрыялы для вывучэння замежных моваў і г.д., што вядзе да вымушанага парушэння адзінага моўна-арфаграфічнага рэжыму ў такіх школах і да пачуцця дыскрымінаванасці ў вучняў;
- дырэктыўныя органы адукацыі вярнуліся да дыскрымінацыйнай трактоўкі беларускай культуры і мовы як другасных, што праяўляецца ў масавай практыцы рыхтавання падручнікаў па-руску і наступнага няякаснага перакладу іх на беларускую мову, ва ўключэнні сусветнай літаратуры ў курс рускай літаратуры і г.д.;
- робіцца імітацыя развіцця ўстановаў з беларускай мовай навучання; планы мерапрыемстваў па пашырэнні сферы выкарыстання роднай мовы з году ў год не выконваюцца; замоўчваецца і засакрэчваецца інфармацыя пра закрыццё беларускамоўных установаў і зніжэнне колькасці навучэнцаў, што атрымліваюць адукацыю па-беларуску; не ствараюцца стымулы для вывучэння і выкарыстання дзяржаўнай мовы.

*Зыходзячы з выкладзенага вышэй,*
*Асамблея ТБШ і ўдзельнікі*
*Нацыянальнай канферэнцыі:*

I. Ухваляюць дзейнасць Таварыства беларускай школы, скіраваную на:

- падтрымку, інфармаванне, кансалідацыю, самаарганізацыю творчых і нацыянальна зарыентаваных педагогаў, бацькоў, навучэнцаў;
- забеспячэнне метадычных патрэбаў беларускіх школаў, якіх не здолела выканаць дзяржава.

II. Патрабуюць ад дзяржаўных, у тым ліку адукацыйных, структураў:

- спыніць матэрыяльную дыскрымінацыю адукацыйнай галіны, забяспечыць ёй годнае фінансаванне, а педагогам – заробкі і пенсіі, вышэйшыя за сярэднія па краіне;
- спыніць паборы ад бацькоў і прымусовую працу настаўнікаў, вызваліць іх ад прымусовага выканання палітычных паслугаў;

- спыніць палітычныя рэпрэсіі супраць педагогаў і навучэнцаў, адмяніць рэпрэсіўныя рашэнні, вярнуць на працу і вучобу звольненых і выключаных па палітычных матывах;
- публічна, з удзелам грамадскасці і незалежных экспертаў, прааналізаваць ходу і наступствы адукацыйнай рэформы;
- спыніць дэгуманізацыю і дэбеларусізацыю зместу школьнай адукацыі;
- вярнуць у школьныя праграмы прадметы гуманітарнага цыклу, выкрасленыя адтуль у выніку рэформы;
- забяспечыць рэальнае раўнаправе школаў з беларускай і рускай мовамі навучання і бесперашкодную магчымасць школьнага навучання па-беларуску ў любым паселішчы і раёне;
- перайсці да практыкі першаснага напісання падручнікаў і дапаможнікаў па-беларуску, не дапускаць адсутнасці беларускамоўных дапаможнікаў пры наяўнасці рускамоўных;
- забяспечыць пераемнасць адукацыйнага працэсу для беларускамоўных школаў праз стварэнне беларускамоўных плыняў на ўсіх універсітэцкіх спецыяльнасцях краіны;
- вярнуць краіну ў агульнаеўрапейскую адукацыйную прастору праз далучэнне да Балонскага працэсу і забеспячэнне акадэмічных свабодаў.

*III. Даручаюць Таварыству беларускай школы:*

- пачаць стварэнне механізму юрыдычнай дапамогі педагогам пры адстойванні іхніх прафесійных і працоўных правоў;
- стварыць Метадычную камісію (раду) ТБШ для грамадскага маніторынгу метадычнага забеспячэння школаў;
- склікаць Усебеларускі бацькоўскі сход.

*24 верасня 2011 г. Менск*

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Міністр адукацыі Рэспублікі Беларусь
А.М.Радзькоў
“12“ сакавіка 2010 г.

**ПЛАН**
**мерапрыемстваў у сістэме Міністэрства адукацыі па папулярызацыі і пашырэнні сферы выкарыстання беларускай мовы ў жыцці грамадства на 2010 і наступныя гады**[2]

| № п/п | Назва мерапрыемства | Тэрмін выканання |
|---|---|---|
| У сферы падрыхтоўкі прававых актаў, справаводства і штодзённага жыцця | | |
| 1. | Забеспячэнне падрыхтоўкі на рускай і беларускай мовах прававых актаў (законаў Рэспублікі Беларусь, якія прымаюцца ўпершыню) у галіне адукацыі, навукі, культуры, рэлігійных і нацыянальных адносін, а таксама сродках масавай інфармацыі | пачынаючы з 2010 года |

[2] Друкуецца ў скарачэнні і без калонкі “Адказныя”. Усяго ў дакуменце 44 пункта.

| | | |
|---|---|---|
| 2. | Ажыццяўленне прастаўлення апастыля на афіцыйных дакументах, прыгодных для ўжывання на тэрыторыі дзяржаў – удзельніц Гаагскай канвенцыі, на беларускай і рускай мовах | пачынаючы з 2010 года |
| 3. | Забеспячэнне падрыхтоўкі і наяўнасці ў дзяржаўных арганізацыях бланкаў і ўзораў запаўнення заяў, дэкларацый і падобных дакументаў на беларускай і рускай мовах | пачынаючы з 2010 года |
| 4. | Стварэнне базавай версіі інтэрнэт-сайта Мінадукацыі, перыядычных выданняў Мінадукацыі на беларускай мове | 2010 г. |
| У сферы адукацыі | | |
| 5. | Распрацоўка Дзяржаўнай праграмы фундаментальных навуковых даследаванняў “Беларуская мова і літаратура” на 2011 – 2015 гг. | 2010 год |
| 6. | Афармленне ва ўстановах адукацыі інфармацыйных стэндаў па пытаннях патрабаванняў новай рэдакцыі Правіл беларускай арфаграфіі і пунктуацыі (далей – Правілы) | І квартал 2010 года |
| 7. | Ажыццяўленне камплектавання бібліятэчнага фонду нарматыўнай прававой, вучэбна-метадычнай, даведачнай літаратурай у дапамогу педагогам, студэнтам, вучням па рэалізацыі палажэнняў Закона Рэспублікі Беларусь ад 23 ліпеня 2008 года ”Аб правілах беларускай арфаграфіі і пунктуацыі“ (далей – Закон) | Пачынаючы са студзеня 2010 года |
| 8. | Забеспячэнне бібліятэк устаноў адукацыі Правіламі, даведнікамі па беларускай граматыцы і арфаграфіі | да жніўня 2010 г. |
| 9. | Правядзенне ва ўстановах адукацыі педагагічных саветаў, класных гадзін і іншых мерапрыемстваў, выпуск радыёгазет з мэтай азнаямлення педагогаў, вучняў і навучэнцаў з новай рэдакцыяй Правіл | 2010 – 2013 гады |
| 10. | Правядзенне ва ўстановах адукацыі ў рамках Тыдня роднай мовы сустрэч з распрацоўшчыкамі Закона | 2010 – 2013 гады |
| 11. | Аналіз нарматыўнага прававога забеспячэння адукацыйнага працэсу па беларускай мове і літаратуры для ўстаноў адукацыі з улікам Закона | студзень – сакавік 2010 года |
| 12. | Арганізацыя працэсу навучання беларускай мове ва ўстановах адукацыі ў адпаведнасці з палажэннямі Закона | пачынаючы з верасня 2010 г. |
| 13. | Арганізацыя ва ўстановах адукацыі факультатыўных заняткаў, курсаў па выбары для вучняў і студэнтаў па вывучэнні новай рэдакцыі Правіл | верасень 2010 г. – верасень 2013 г. |
| 14. | Забеспячэнне паэтапнага выдання падручнікаў, вучэбных дапаможнікаў, вучэбна-даведачных матэрыялаў на беларускай мове для агульнаадукацыйных устаноў з улікам новай рэдакцыі Правіл | 2010 – 2015 гады |
| 15. | Забеспячэнне паэтапнага выдання падручнікаў, вучэбна-метадычных дапаможнікаў, вучэбна-даведачных матэрыялаў па сацыяльна-гуманітарных, прыродазнаўчых, навуковых, агульнапрафесійных і спецыяльных дысцыплінах для студэнтаў ВНУ ў адпаведнасці з новай | 2010 – 2015 гады |

| | | |
|---|---|---|
| | рэдакцыяй Правіл | |
| 16. | Падрыхтоўка і выданне дапаможніка “Пішам па-беларуску: даведнік па арфаграфіі і пунктуацыі” для настаўнікаў агульнаадукацыйных устаноў | верасень 2010 года |
| 17. | Падрыхтоўка і выданне арфаграфічнага слоўніка беларускай мовы для агульнаадукацыйных устаноў і ўстаноў, якія забяспечваюць атрыманне прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі | студзень – верасень 2010 года |
| 18. | Падрыхтоўка дапаможніка па дысцыплінах філалагічнага цыкла ў адпаведнасці з новай рэдакцыяй Правіл | 2010 год |
| 19. | Арганізацыя мэтавых кароткатэрміновых курсаў павышэння кваліфікацыі па пытаннях змянення Правіл для кіраўнікоў устаноў адукацыі, настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры, настаўнікаў-прадметнікаў агульнаадукацый-ных устаноў з беларускай мовай навучання, справаводаў і іншых катэгорый кадраў адукацыі | першае паўгоддзе 2010 года |
| 20. | Арганізацыя курсаў павышэння кваліфікацыі для выкладчыкаў беларускай мовы і літаратуры ўстаноў, якія забяспечваюць атрыманне прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі, па азнаямленні з новай рэдакцыяй Правіл | пачынаючы з 2010 года |
| 21. | Унясенне ў вучэбна-тэматычныя планы базавага павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі тэм, якія тычацца Закона | 1 студзеня 2010 г.– верасень 2013 г. |
| 22. | Уключэнне ў планы курсавой падрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі выкладчыкаў вышэйшых навучальных устаноў тэм, якія тычацца Закона | 2010/2011 навучальны гол |
| 23. | Арганізацыя мэтавых курсаў павышэння кваліфікацыі выкладчыкаў вышэйшых навучальных устаноў: ”Сучасныя аспекты вывучэння беларускай мовы і літаратуры“, ”Новая рэдакцыя правіл беларускай арфаграфіі і пунктуацыі“ | на працягу 2010 г. |
| 24. | Арганізацыя навукова-метадычных семінараў для выкладчыкаў вышэйшых навучальных устаноў ”Актуальныя пытанні арганізацыі вывучэння новай рэдакцыі Правіл“ | на працягу 2010 г. |
| 25. | Правядзенне сістэмнай інфармацыйна-тлумачальнай работы па прапагандзе Закона ў сродках масавай інфармацыі (інтэрв’ю, круглыя сталы, рубрыкі, прэс-канферэнцыі і іншае) | пастаянна |
| 26. | Вывучэнне, абагульненне і распаўсюджванне вопыту работы педагогаў па рэалізацыі асноўных палажэнняў Закона | 2010 – 2013 гады |
| 27. | Арганізацыя бясплатных курсаў для дарослых па месцы працы, пры ўстановах адукацыі, якія дапамогуць авалодаць Правіламі | пачынаючы з 2010 года |
| 28. | Забеспячэнне арфаграфічнай аднастайнасці ў сродках | пачынаючы з 1 |

| | | |
|---|---|---|
| | масавай інфармацыі, заснавальнікам якіх з'яўляецца Міністэрства адукацыі, у адпаведнасці з Законам | верасня 2010 г. |
| 29. | Пашырэнне магчымасці атрымання беларускамоўнай адукацыі на ўсіх узроўнях і ў адпаведнасці з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь забеспячэнне права кожнага грамадзяніна выбіраць мову навучання ва ўстановах адукацыі:<br>арганізацыя тлумачэння заканадаўства аб магчымасці выбару мовы навучання на бацькоўскіх сходах;<br>арганізацыя ў дашкольных установах правядзення дзён беларускай мовы, заняткаў па развіцці беларускамоўных узаемаадносін;<br>правядзенне першага ўрока навучальнага года ва ўстановах адукацыі на беларускай мове;<br>арганізацыя па жаданні вучняў і іх бацькоў вывучэння беларускай мовы і культуры маўлення на факультатыўных занятках;<br>садзейнічанне пашырэнню сеткі дашкольных устаноў (груп) у гарадской мясцовасці, якія працуюць на беларускай мове;<br>садзейнічанне павелічэнню колькасці класаў з беларускай мовай навучання ў агульнаадукацыйных установах гарадской мясцовасці;<br>паступовае павелічэнне ўдзельнай вагі прадметаў, якія выкладаюцца на беларускай мове ў агульнаадукацыйных установах, на гуманітарных спецыяльнасцях вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў (у першую чаргу педагагічных, культуры і мастацтва, журналістыкі) | пачынаючы з 2010 года |
| 30. | Увядзенне для абавязковага вывучэння ва ўсіх вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных установах курса "Беларуская мова (прафесійная лексіка)" | з 2010/2011 навучальнага года |
| 31. | Увядзенне для абавязковага вывучэння пры падрыхтоўцы аспірантаў і саіскальнікаў вучонай ступені кандыдата навук курса "Беларуская мова (прафесійная лексіка)" | пачынаючы з 2010 года |
| 32. | Распрацоўка электронных сродкаў на беларускай мове для выхавання і навучання школьнікаў, навучэнцаў прафесійна-тэхнічных і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, студэнтаў ВНУ | пастаянна |
| 33. | Правядзенне інтэрнэт-конкурсаў, алімпіяд у галіне беларускай мовы, літаратуры і культуры | пачынаючы з 2010 года |
| 34. | Павелічэнне колькасці выданняў і перавыданняў твораў класікаў беларускай літаратуры і сучасных аўтараў (у тым ліку ў электронным выглядзе), якія ўваходзяць у школьную праграму (серыі "Школьная бібліятэка" і "Бібліятэка школьніка"), з улікам рэальнага спажывецкага попыту і фінансавых магчымасцей | пачынаючы з 2010 года |
| 35. | Арганізацыя рэгулярных сустрэч з беларускімі пісьменнікамі з мэтай правядзення асветніцкай работы ў | пастаянна |

| | | |
|---|---|---|
| | дашкольных і агульнаадукацыйных установах рэспублікі | |
| 36. | Арганізацыя ва ўстановах адукацыі радыёчасопісаў, выдання насценных газет, часопісаў, прысвечаных жыццю і творчасці беларускіх пісьменнікаў, пытанням развіцця беларускай мовы і літаратуры | пастаянна |
| 37. | Пашырэнне правядзення ва ўстановах адукацыі віктарын, літаратурных конкурсаў, ранішнікаў, свят, тэматычных вечарын, прысвечаных творчасці беларускіх пісьменнікаў | пастаянна |
| 38. | Пашырэнне сеткі гурткоў, клубаў, іншых форм работы з вучнямі па вывучэнні гісторыі Беларусі, культуры мовы ва ўстановах пазашкольнага выхавання і навучання | пачынаючы з 2010 года |
| 39. | Пашырэнне наведвання вучнямі, навучэнцамі і студэнтамі краязнаўчых і літаратурных музеяў, беларускамоўных тэатраў | пастаянна |
| 40. | Правядзенне чытацкіх канферэнцый, кніжных выстаў у бібліятэках устаноў адукацыі (“Пісьменнікі-юбіляры”, “Спеў пра Белую Русь”, “Радзіма белых буслоў”) | пастаянна |
| 41. | Публікацыя ў сродках масавай інфармацыі артыкулаў, матэрыялаў з вопыту работы педагагічных калектываў па пытаннях далучэння дашкольнікаў, навучэнцаў, студэнтаў, іх бацькоў да каштоўнасцей беларускай культуры | пастаянна |

Намеснік Міністра К.С.Фарыно

# Педагагічны дзёньнік

**сьцісла і сьціпла**
**(за перыяд са жніўня 2011 г. па верасень 2011 г.)**



***Універсітэт*** **Самыя падрыхтаваныя студэнты** прыйшлі ў БДУ, БДМУ, МДЛУ, БДЭУ. Аднак засталіся не запоўненымі бюджэтныя 134 месцы на дзённай форме навучання і 203 – на завочнай.

**Толькі палова іншагародніх студэнтаў змогуць уладкавацца ў інтэрнатах** сталічных універсітэтаў. Найлепшае становішча ў МДМУ, дзе функцыянуе восем інтэрнатаў. БДТУ і БНТУ забяспечваюць прыблізна 48% ад агульнай колькасці жадаючых. У Акадэміі мастацтваў толькі адзін інтэрнат.

**Кошт навучання ў ВНУ павысіўся** да 20%. Напрыклад, у БДТУ ён складае 6 626 руб. у год, у ГрДУ – ад 4 128 да 6 269.

Цяпер **памеры стыпендый будуць прывязаны да тарыфнай стаўкі** першага разраду. Вучэбная стыпендыя магістрантам устанаўліваецца на ўзроўні стыпендыі студэнтаў выдатнікаў.

Былыя палтівязні Фёдар Мірзаянаў і Ілля Васілевіч, што былі асуджаны пасля прэзідэнцкіх выбараў, **збіраюцца з'ехаць вучыцца за мяжу.**

**Наста Палажанка і Уладзімір Яроменак асуджаны** на 11 і 12 сутак адміністрацыйнага арышту адпаведна за парушэнні парадку правядзення і арганізацыі масавага мерапрыемства.

Што гэта такое магло здарыцца, калі студэнтам зрабілі не проста льготны праезд у горадзе, а зусім бясплатны? **Такога яшчэ не было.**

Амбасада Італіі **адхіліла візу рэктару БДУ** Сяргею Абламейку, якую выдала яму яшчэ ў снежні 2010 года. Адмова тлумачыцца спісам неўязных чыноўнікаў на тэрыторыю Еўрасаюза, які быў складзены пасля прэзідэнцкіх выбараў.

**Заўчасна памерла Ядвіга Грыгаровіч** (31.07), шчырая беларуска, былы рэктар БДУКіМ, якая зрабіла важкі ўнёсак у развіццё беларускай вышэйшай школы.

## *Школа*



**"Настаўнікам года Рэспублікі Беларусь"** IX конкурса стала педагог англійскай мовы гімназіі №1 Дзятлава Ірэна Зубрыліна.

Сёлета ў краіне **зачынена 65 школ.** Асноўная прычына – недахоп вучняў.

З ліцэя БНТУ за ўдзе у маўклівай акцыі **адлічаны лаўрэат прэзідэнцкай прэміі** Раман Пратасевіч. Юнак – неаднаразовы пераможца алімпіяд па фізіцы, марыць паступіць у піцерскую вайскова-касмічную акадэмію. А цяпер Раман пакінуюць сям'ю (бацька выкладае ідэалогію ў вайсковай акадэміі) і думае працягваць вучобу ў коласаўскім ліцэі (Гданьск).

Прафесар Міхась Тычына, выкладчык ліцэя, выпусціў цікавую кнігу **«Вялікія і Малыя Тычыны: легенды і рэальнасць»** пра знакаміты род са Случчыны і Салігоршчыны.

## *Грамадская і культурная дзейнасьць*



Шклоўская раённая аганізацыя **"Белая Русь"** агучыла ініцыятыву аб ператварэнні грамадскай арганізацыі ў партыю.

Беларуская спявачка Наста Някрасава і група «FolkRoll» **перамаглі ў прэстыжным нацыянальным конкурсе фестывалю «Nowa Tradycja»,** што арганізуе польскае радыё. Сёлета выйшаў дыск, запіс і выданне альбома за кошт «Polskie Radio SA». У ім 11 трэкаў – гэта песні пераважна з палескага рэгіёна, адкуль родам спявачка.

Наста – выпускніца Мінскага музычнага вучылішча. Набывала спецыяльнасць фалькларыста і выкладчыка сусветнай і айчыннай культуры ў БДПУ, перавялася на завочнае навучанне

роднай alma mater у сувязі з паступленнем на дзённае навучанне Варшаўскага ўніверсітэта. Спявала ў складзе групы «NHS», у БДПУ арганізавала фальклорны гурт «Квецень».

У самым канцы верасня ў маладзвым тэатры эстрады адбыўся першы сольны канцэрт у Беларусі ансамбля FolkRoll і Насты Някрасавай.

*На фотаздымку*: Наста Някрасава на фальклорна-этнаграфічнай практыцы ў Івацэвіцкім раёне ў час навучання на другім курсе БДПУ. 2009 год.

Набывае папулярнасць **фальклорны гурт "Квецень"** БДПУ (кіраўнік Таццяна Сянько, студэнтка факультэта эстэтычнай адукацыі). Выступленне ў Музеі гісторыі беларускай літаратуры *(на здымку)*.



2 жніўня адбыўся пікет каля Горацкай калоніі (Магілёўская вобласць), дзе адбывае пакаранне лідэр зарэгістраванага ў Чэхіі "Маладога фронту" Дзмітрый Дашкевіч. Судамі Дрыбіна і Горак было **асуджана 14 удзельнікаў** (суткі або штрафы), у тым ліку Наста Палажанка, студэнтка ЕГУ і нявестка Дзмітрыя.

*Віншуем!*

**Генадзь Бураўкін** адзначыў 75 гадоў.

**Уладзіміру Дзіско** – 75.

***Беларусь і сьвет***

Беларусь упершыню заняла месца **самай не шчаслівай краіны**. Індэкс нягод (Misery Index) складваецца на аснове стану інфляцыі і беспрацоўя, што больш за ўсё б'е па дабрабыту людзей. Раней такой была Украіна. Самая шчаслівая – Нарвегія, затым – Швейцарыя і Японія.

**Лепшымі ВНУ свету** ў рэйтынгу кампаніі QS з'яўляюцца Кембрыджскі, Гарвардскі, Масачусецкі, Оксфардскі. Дваццатку лепшых цалкам складаюць амерыканскія і брытанскія ўстановы.

# Сказанулі

**Лешчанка В.К. Объясните, зачем?**

Для таго каб зразумець узровень нашай школы, прывяду толькі такі прыклад – цытату з падручніка па біялогіі за 10-ы клас:

«Таким образом, образование бивалентов при коньюгации гомологичных хромосом в профазе первого мейоза создаёт условия последующей редукции числа хромосом. Формирование гаплоидного набора в гаметах обеспечивается расхождением в анафазе 1 не хроматид, как в митозе, а гомологичных хромосом, которые ранее были объединены в биваленты. Второе мейотическое деление следует сразу за первым и сходно с обычным митозом (поэтому его часто называют митозом мейоза), но в отличие от митоза, клетки

вступающие в него, имеют гаплоидный набор хромосом». *(НВ, 20 чэрв.).*

**Аляксандр Лукашэнка: «Назрела необходимость встряхнуть педагогическую общественность страны»**

Гледзячы на ўсё, рэфармаванне сярэдняй школы Беларусі на закончылася… На Рэспубліканскай нарадзе педагагічнага актыву А.Лукашэнка заявіў, што «назрела необходимость встряхнуть педагогическую общественность страны».
- Учитель прыходит в школу, как на завод, фабрику: отработал время и ушёл домой… *(Грынявіцкая В. НВ, 30 жн.).*

**Вяскоўцаў і сірот могуць пазбавіць ільгот пры паступленні ў ВНУ.**

На гэта намякнуў "адказны" за ўступную кампанію Анатоль Рубінаў. "Ільгот на мазгі і на талент не павінна быць", - заявіў старшыня Савета Рэспублікі і дзяржкамісіі па кантролі за правядзеннем уступнай капаніі Анатоль Рубінаў.

"На спецыяльнасць "Паліталогія" на бюджэт быў залічаны абітурыент, які набраў 112 балаў. А той, які набраў 337, не прайшоў. Тут трэба нешта мяняць…" *(НВ, 30 жн.).*

***Адукацыя і культура***

## НІЛ ГІЛЕВІЧ: "НЕ ТРАЦЬЦЕ ВЕРЫ І МУЖНАСЦІ, СЯБРЫ!"

У народзе бытуе трапнае і справядлівае выслоўе, што не месца ўпрыгожвае чалавека, а чалавек месца. Яно ў поўнай меры адпавядае слыннаму паэту і грамадскаму дзеячу XX і XXI стагоддзяў прафесару Нілу Сымонавічу Гілевічу.

Яго шматгранная дзейнасць на карысць Беларусі, беларускага народа, роднай мовы, нацыянальнай культуры ўзвысіла не толькі Лагойшчыну, дзе ён нарадзіўся 80 гадоў таму назад, але і ўсю беларускую зямлю. Нам пашчасціла жыць і працаваць, весяліцца і расчароўвацца, змагацца і спадзявацца разам з вялікім чалавекам эпохі, роднай зямлі, асвечанай прасветлай любоўю паэта і грамадзяніна.

Высокая асветніцкая місія настаўніка праявілася ў першых кроках на педагагічнай ніве кафедры беларускай літаратуры Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Сотні выпускнікоў вядучага флагмана навукі і культуры з асаблівай цеплынёй успамінаюць урокі любові да роднай мовы, літаратуры, вуснай народнай творчасці, Беларусі, Гілевічавы ўрокі, якія даюць нясконачаную моц у змаганні за роднае і адвечнае. Аснова кандыдацкай дысертацыі лягла ў аснову літаратуразнаўчай працы "Акрыленая рэвалюцыяй (паэзія "Маладняка")" (1962).

Спасцігаючы ісціну быцця нельга было не вярнуцца да вытокаў слова, вуснай народнай творчасці, дзе Ніл Гілевіч спраўдзіў сябе як творца-паэт, літаратар, крытык, перакладчык, фальклярыст, удумлівы даследчык таямніц народных скарбаў. Творчае выкарыстанне здабыткаў народнай паэтыкі і архітэктонікі праглядаецца асабліва ў цыклах "Сучасныя замовы-загаворы", "Праклён", паэмах "Недзяленя", рамане ў вершах "Родныя дзеці", сатырычных творах. Прыкладам глыбокага даследавання паэтыкі народнай спадчыны вызначаюцца кнігі "Наша родная песня" (1968), "З клопатам пра песні народа" (1970), "Паэтыка беларускай народнай лірыкі" (1975), "Паэтыка беларускіх загадак" (1976). Укладзеныя і рэдагаваныя ім тамы з'яўляюцца надзённымі настольнымі дапаможнікамі студэнта, педагога, фальклярыста і этнографа: "Песні сямі вёсак: Традыцыйная народная лірыка Міншчыны" (1973), "Песні народных свят і абрадаў" (1974), "Лірычныя песні" (1976), "Лірыка беларускага вяселля" (1979),

“Народныя казкі-байкі, апавяданні і мудраслоўі” (1983), “Замовы” (2000).

Больш пераканаўча і запамінальна можна сказаць у паэзіі, таму і нездарма нам думаецца, што Настаўнік і Грамадзянін звярнуўся да ёмкіх сродкаў паэтычнага радка. “Песня ў дарогу” (1957), “Прадвесне ідзе па зямлі” (1959), “Неспакой” (1961), “Бальшак” (1965), “Перазовы” (1967), “Лісце трыпутніку” (1968), “А дзе ж тая крынічанька” (1972), “Запаветнае” (1975), “Актавы” (1976), “У добрай згодзе” (1979), “Выбраныя творы” (1981; 1991), “Родныя дзеці” (1985), “Повязь” (1987), “Незалежнасьць” (1991), “Жыта, сосны і валуны” (1992), “На высокім алтары”, “Талісман” (1994), “Збор твораў: У 23 т.” (з 1996) – важкія этапы развіцця беларускай лірыкі. А яшчэ ж – творы для дзяцей, проза, кнігі сатыры і гумару, у тым ліку – паўлегендарны “Сказ пра Лысую Гару” (1971-1975). Народам паэзія вялікага творцы прынята, уключана ў вучэбныя хрэстаматыі, многія вершы сталі песнямі.

Сэрца паэта-грамадзяніна перапоўнена эмоцыямі, настроямі, перажываннямі: спявае ад прыгажосці і любові да роднага краю, здзейсненых подзвігаў і бескарыслівых учынкаў людзей; смяецца над яго заганамі; грозна і трывожна трымціць, ірвецца ў роспачы і гучыць набатам, крышачы крыўдзіцеляў Беларусі. Найбольш вострыя і набатныя кнігі – гэта публіцыстыка, літаратурна-крытычныя артыкулы, вершы – “У гэта веру” (1978), “Удзячнасць і абавязак” (1982), “Годнасць, сумленне, мужнасць” (1988), “Вяртанне і працяг” (1990), “Мой белы дзень” (1992), “Выбар” (1993), “Талісман” (1994), “Любоў прасветлая” (1996), “Толькі мы самі” (2005), “Мой тэстамент” (2006). Гэта – “белыя” кнігі, у якія гонар патрапіць любому беларусу-патрыёту і ганьба “герастрату”, памятаючы пра судны дзень.




Добра ведаюць Ніла Сымонавіча і за межамі Беларусі як перакладчыка і грамадскага дзеяча. У перакладзе з балгарскай у нас загучала паэзія, проза, фальклор братняга народа: аповесць П. Вежынава “Сляды застаюцца” (1960), раман С. Даскалова “Свая зямля” (1961) і яго зборнік апавяданняў “Любча-безбілетнік” (1959), зборнік апавяданняў “Скарб” (1967), зборнікі вершаў “Чарадзейны ліхтарык” (1968), “Сто гадоў, сто паэтаў, сто песень” (1978), “Перазараджаным набоем” (1981), Н. Вацпарава “Песня пра чалавека” (1982), анталогіі “Ад стром балканскіх” (1965), “Хай зорыць дзень!” (1973), “Верная вялікім запаветам. Сучасная балгарская паэзія. 1956—1976” (1977), зборнік “Балгарскія народныя песні” (1961) і інш. Дзякуючы стараннямі перакладчыка, паэта і фалькларыста знаёмы беларускі чытач з фальклорам і творамі югаслаўскіх (“Па камянях, як па зорах”, 1981), славенскіх (“Маці мая, Славенія”, 1976), а таксама польскіх, рускіх, украінскіх, сербалужыцкіх паэтаў. У 1983 годзе ўбачыў свет зборнік выбраных перакладаў славянскіх паэтаў “Роднасць”, а яшчэ

раней – манаграфія “Вусная народная творчасць і сучасная лірычная паэзія ўсходніх і паўднёвых славян” (1978). У сваю чаргу творчасць пісьменніка ведае англамоўны, балгарскі, польскі, украінскі, рускі чытач.

Прафесійная і грамадская дзейнасць арганічна спалучаліся. 1-ы сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў БССР (1980—1989), сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў СССР (1981-1991), старшыня пастаяннай камісіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь па адукацыі, культуры і захаванні гістарычнай спадчыны (1990—1996), старшыня Таварыства беларускай мовы (1989-1997), уваходзіў ці ўваходзіць у кіраўнічыя органы розных арганізацый – Савет міжнароднага фонду славянскага пісьменства і славянскіх культур, Міжнародная асацыяцыя беларусістаў і інш. Цяжка назваць усё здзейсненае дзеля Беларусі.

За вялікую дзейнасць паважанага ў народзе чалавека адзначалі Дзяржаўнай прэміяй імя Янкі Купалы (1980), Міжнароднай прэміяй імя Хрыста Боцева (1986), ганаровымі званнямі Заслужаны дзеяч навукі (1980), Народны паэт Беларусі (1991), узнагароджвалі ордэнамі балгарскім – Кірыла і Мяфодзія 1-й ступені (1966), Дружбы народаў (1981), Працоўнага Чырвонага Сцяга (1984), Югаслаўскай зоркі са стужкай (1986), украінскага – князя Яраслава Мудрага 2-ой ступені (2006), медалём Францыска Скарыны (1990).

* * *

Зрэдку, прыязджаючы ў сталіцу Беларусі, я, тады яшчэ малады завуч, дырэктар СШ з Палесся, пачынаючы паэт і літаратар, з цікаўнай узнёсласцю, акрылёнасцю і асаблівай душэўнай чуйнасцю адносіўся да сустрэч са слыннымі творцамі прыгожага пісьменства, чые партрэты аздаблялі школьныя падручнікі, чые мудрыя вочы глядзелі на дзяцей па-боску, настаўлялі нас, настаўнікаў, як пасрэднікаў-святароў, на святарскую дзейнасць з маладымі душамі. Я з вучнёўскай сарамлівасцю найчасцей слухаў і, асмеліўшыся, сціпла распытваў пра творчасць і нейкія сямейныя справы ў Васіля Быкава, Пімена Панчанкі, Паўла Кавалёва, Сяргея Грахоўскага, Рыгора Барадуліна, Генадзя Бураўкіна, Ніла Гілевіча…

Бадай што першай публікацыяй у “ЛіМе” быў мой водгук “І зборнік, і нарыс” на фальклорны том “Народныя казкі-байкі, апавяданні і мудраслоўі” (1983), дзе Н.С. Гілевіч выступаў не толькі як складальнік добротнага выдання разнастайных апавядальных і афарыстычных твораў, сабраных студэнтамі-філолагамі БДУ, але і аўтарам тэарэтычных нататкаў мала вывучаных на той час жанраў (анекдоты, бываліцы, апавяданні-ўспаміны, прыгаворкі-зычанні, прымхліцы і інш.). Памятаецца, пазней мой калега-фалькларыст прызнаваўся, што ў коле спецыялістаў яны задаваліся пытаннем, хто ж такі настаўнік з глыбінкі, што сумеўся азваца пра даволі на той час спрэчныя пытанні жанравай дэфініцыі.

З удзячнасцю, а парой і вінаватасцю за залішнюю сваю паспешнасць, малады максімалізм і нігілізм успамінаю Гілевіча-навукоўца і грамадскага дзеяча перыяду перабудовы. Калі аднойчы паўстала праблема кворума на спецыялізаванай навуковай радзе па абароне кандыдацкіх дысертацый у Інстытуце мастацтвазнаўства, этнагарфіі і фальклору АН, давялося тэлефанаваць Нілу Сымонавічу-дэпутату і кіраўніку камісіі Вярхоўнага Савета і прасіць яго прысутнасці на чарговым пасяджэнні, дзе ў парадку дня мая праца, і ён прыйшоў. Затым праглядаў тэлебачанне, дзе транслявалася пасяджэнне сесіі, і з няёмкасцю ў душы заўважыў: пытаецца старшыня пасяджэння Вярхоўнага Савета, а дзе Гілевіч, нехта з дэпутатаў дэмакратычнага кола апраўдваецца, што прафесар на важнай нарадзе ў Акадэміі навук.

Затым не аднойчы даводзілася наведваць будынак Вярхоўнага Савета, дзе актыўна працавала Камісія па адукацыі і культуры, захаванні гістарычнай спадчыны, у якую ўваходзілі нашы сябры Алег Трусаў, Лявон Баршчэўскі, Яўген Цумараў і іншыя. Н.С. Гілевіч, можна сказаць, змяніў крэсла старшыні ТБМ на старшыні адной з важнейшай названай камісіі. Спраў было нямала. Тады я ўзначальваў ТБМ Акадэміі навук і быў намеснікам старшыні Гарадскога бацькоўскага камітэта (ГБК) беларускамоўных класаў Мінска. Нашы сябры па ГБК былі абраны ў розныя саветы: у Вярхоўны – Уладзімір Новік, Яўген Цумараў, Валянцін Голубеў, Пятро Садоўскі (старшыня камісіі), у Мінскі гарадскі – Ігар Чарняўскі і Анатоль Гурыновіч (намеснік старшыні Савета). Асноўная ідэалагічная барацьба паміж старым і новым, аджываючым і адраджэннем разгаралася на вуліцах і плошчах, сесіях і аўдыторыях, газетах і часопісах. Вось дзе спатрэбілася выдатнае майстэрства прамоўцы, вытанчанае і загартаванае паэтычным і публіцыстычным пяром у пакаёвай цішы і вірлівай студэнцкай і разнастайных літаратурных аўдыторыях. Гілевічавы ўспаміны, летапісца той незабыўнай пары, чытаюцца з неймаверным захапленнем. З якой цяжкасцю прабіваліся ў кіраўніцтва камісій нашы дэмакраты, а несумненны аўтарытэт Ніла Сымонавіча ўзнёс яго, здаецца, з першай спробы і амаль адзінагалосна.

Шмат дыскусій у авальнай зале было прысвечана адукацыйным пытанням. Ды й не дзіўна! Беларусь з такой шматпакутнай гісторыяй, вынішчаная няшчадным заваёўніцкім кап'ём і асімілятарскім бізуном. Ад генерал-губернатараў мураўёвых і самавырашчаных генералаў сарокіных цягнецца наша бяда. Памятаецца, Нілу Сымонавічу спадабаўся мой артыкул у "Народнай газеце", дзе даводзілася апаніраваць дэпутату-генералу Сарокіну, які бэсціў часопіс "Пралеска", што друкавала патрыятычныя творы Уладзіміра Арлова, тагачасную школу, у якой нібы пераважае беларуская мова і інш.

Думаю, што Нілу Гілевічу была вельмі блізкая думка аб паступовым павяртанні чыноўніцтва да роднай мовы і нацыянальнай культуры. І гэтую лінію ён паслядоўна праводзіў, што супярэчыла многім гарачым нацыяналістычным галовам, якія імкнуліся "ссякаць" зрусіфікаваныя галовы, як у час рэвалюцыі і грамадзянскай вайны, пакінуўшы расцярушаную краіну па сутнасці без спецыялістаў. Сталі ж з'яўляцца ў нас і свае генералы і палкоўнікі, эканамісты і фізікі.

У адно памкненне раўнуюцца дзеянні, тыпу ўручэнне Кебічу на адным са з'ездаў пасведчання сябра ТБМ. Часам, выпрацоўваючы розныя дакументы, мы не заўсёды разумелі Гілевіча і не аднойчы ў запале дыскусій пыталіся ў яго, ці з намі ён. А Сойм БНФ наогул выключыў палітыка са свайго складу.

У чарговы раз, калі павісла зноў пагроза над беларускай асветай, паўстала неабходнасць ствараць Таварыства беларускай школы, як некалі ў Заходняй Беларусі. Раўнуючыся на Гілевічаў прынцып у адносінах да чыноўнікаў я прапаноўваў сябрам шырока далучаць кіраўнікоў розных рангаў у новае аб'яднанне, каб разам за адным сталом вырашаць надзённыя праблемы беларускага школьніцтва, не заўсёды выходзячы на плошчу. Дзеля гэтага нават выкарыстаць такі "пернік", як рэгламентаванае наданне званняў "акадэмікаў", "прафесараў" і г.д. Дарэчы, на ўстаноўчы з'езд ТБШ у 1996 годзе прыехала нямала і раённых чыноўнікаў. Адным з вядучых пасяджэння быў прафесар Леанід Ціханаў, рэктар БДПУ, а Аляксандр Жук, рэктар Інстытута ўдасканалення настаўнікаў, што тады месціўся на Ульянаўскай вуліцы, для такога мерапрыемства выдзеліў без аплаты памяшканне. У той час я па службе быў звязаны з многімі кіраўнікамі ад адукацыі,

у тым ліку і ў галоўным ведамстве – працаваў дырэктарам Беларускага навукова-метадычнага цэнтра гульні і цацкі Міністэрства адукацыі.

Агульны настрой з'езда быў нервовы. Дэмакраты ганьбяць чыноўнікаў, якія на самой справе нішчаць беларускую школу, а апошнія імкнуцца хутчэй збегчы з залы. У перапынку з'езда пра іх я пачуў ад некага: прыехалі сюды, захацелі ў ТБШ і новых пасад.

Зразумела, мая ідэя не прайшла, хоць і абралі мяне віцэ-прэзідэнтам, а былога першага намесніка міністра адукацыі Мікалая Пятроўскага па маёй прапанове прэзідэнтам РГА "ТБШ". Н.С. Гілевіч тады рэзка выступіў супраць ідэі ТБШ-акадэмія, заявіўшы, што ў такую арганізацыю ён і нагой не ступіць. Цяпер думаю, што ён меў рацыю, хоць і стаю на тым, што нельга было ў любы перыяд безаглядна адкідаць чыноўнікаў ад нацыянальнай справы. Даўно каюся, што ў запале тады кінуў паважанаму Нілу Сымонавічу: "А Вас яшчэ і ніхто сюды не запрашаў!". Прабачце, каюся, віноўны!

І вельмі ўдзячны, што ён ніколі пра крыўду і не ўспамінаў, працаваў дзеля працвітання роднай мовы, культуры, Беларусі. Асабліва прыгадваюцца два мерапрыемствы, якія разам мы ў ТБШ зладзілі. Гэта – чарговы конкурс адукацыйных выданняў, вучнёўскіх і студэнцкіх работ (2004) і конкурс "Прэмія імя акадэміка Вацлава Ластоўскага для беларускамоўных выкладчыкаў ВНУ" (2007), дзе яму арганізацыя прапанавала ўзначаліць журы.

Асноўнае публіцыстычнае крэда Гілевіча-грамадзяніна, яго вызначальныя словы-сімвалы: Беларусь, Незалежнасць, Мова. Побач таксама яшчэ можна дадаць – нацыянальная школа. Колькі сказана і здзейснена ім дзеля станаўлення асветы на роднай мове. Асабліва гэта бачна, перачытваючы публіцыстычны том "Толькі мы самі". Адны толькі назвы артыкулаў, прамоў і нататак яскрава гавораць самі за сябе "Падручнікі для выхавання… каго? Манкуртаў ды Іванаў без роду-племені?", "І яшчэ раз аб роднай мове", "Апомніцеся!"(у абарону ліцэя імя Якуба Коласа), "Голас настаўніцтва", "Не трацьце веры і мужнасці, сябры!" (слова да настаўнікаў, выкладчыкаў беларускай мовы і літаратуры) і інш.



Здароўя Вам, паважаны Ніл Сымонавіч!

**Алесь ЛОЗКА**

*Ніл Гілевіч на ганараванні лаўрэатаў прэміі імя акадэміка Вацлава Ластоўскага для беларускамоўных выкладчыкаў вышэйшых навучальных устаноў. 2007 г.*

## Уладзіміру Коласу – 60

Пра Уладзіміра Коласа, які ў гэтыя дні адзначае свой юбілей, можна сказаць адно: гэта прадстаўнік той не вельмі шматлікай часткі нашага сучаснага грамадства, якая па-старому называецца "інтэлігенцыя" і ў аснову ўсяго жыцця якой пакладзена паняцце каштоўнасцяў. Сярод такіх каштоўнасцяў я ў першую чаргу назваў бы любоў да свабоды, павагу да думак іншых людзей, непахіс-ную веру ў выратавальную місію нацыянальнай культуры і мовы.



Уладзімір Колас прыйшоў на свет 22 верасня 1951 года ў Мінску. Але калі б ён быў старэйшы на гадоў пяць, месцам яго нараджэння беларуская сталіца ніяк бы зрабіцца не змагла. Яго бацька, будучы вядомы тэатральны крытык і публіцыст Георгій Колас, яшчэ двухгадовым дзіцём, быў разам з бацькамі вывезены з роднай для яго Ігуменшчыны на спецпасяленне ў Комі-Пярмяцкую нацыянальную акругу, што на самым поўначы Расіі. З расповедаў сваіх дзеда і бабулі Уладзімір Колас запомніў жахлівую карціну: як шматдзетную сям'ю карнікі НКВД высадзілі з грузавіка проста ў тундры і далі загад… не паміраць адразу, а з наступнага дня выходзіць на працу. Старая сялянская загартоўка дапамагла ім не памерці. Але падзеі 30-х, першай паловы 40-х гадоў назаўсёды ўрэзаліся ў памяць Георгія Коласа. І абодва яго сыны – Уладзімір і Зміцер (сёння гэта вядомы беларускі выдавец, перакладчык, кавалер французскага ордэна "За заслугі перад культурай") – з самага дзяцінства выхоўваліся ў атмасферы, якую можна ахарактарызаваць як "пазбаўленне ад савецкіх ілюзій". Сям'я Георгія Коласа блізка сябравала з сем'ямі Валянціна Тараса, Навума Кісліка, іншых мінскіх інтэлігентаў, якія заўсёды захоўвалі крытычнае мысленне.

*На здымках: у Ліёне (Францыя)*

Закончыўшы звычайную мінскую школу, Уладзімір Колас здолеў паступіць на вельмі прэстыжны ў свой час перакладчыцкі факультэт Мінскага педынстытута замежных моў (аддзяленне французскай мовы). Размеркавання за мяжу – якое атрымлівалі іншыя аднакурснікі – не атрымаў: кантралёрам у цывільным падавалася занадта падазроным паходжанне новаспечанага перакладчыка з французскай і англійскай моў. Замест гэтага Уладзіміра Коласа



чакала настаўніцкая праца ў маленькай вясковай школе на Талачыншчыне. Гэтая праца не была працяглай (Уладзімір Колас быў мабілізаваны на службу ў тагачасны т.зв. "Беларускі полк"), але першы каштоўны педагагічны досвед усё ж такі быў набыты. Пасля заканчэння вайсковай службы нерэалізаваныя датуль творчыя памкненні прывялі Уладзіміра Коласа на маскоўскія Вышэйшыя рэжысёрскія курсы, дзе ён займаўся ў класе вядомага расійскага рэжысёра Аляксандра Міты. Вярнуўшыся ў Мінск, Уладзімір Колас атрымоўвае магчымасць працаваць на "Беларусьфільме". З'яўляюцца яго першыя фільмы, "Дрэвы на асфальце", "Хочаце – кахайце, хочаце – не" і інш. Запрашаючы здымацца ў сваіх фільмах вядомых расійскіх актораў (напрыклад, Аляксея Булдакова), Уладзімір Колас усё ж такі аддае прыярытэт беларускім. Запамінальныя вобразы ў яго фільмах ствараюць Галіна Макарава, Таццяна Мархель, Павел Кармунін; у фільмах пачынае гучаць беларуская мова (што, трэба пагадзіцца, і цяпер бывае нячаста).

У другой палове 80-х гадоў Уладзімір Колас пачынае здымаць і дакументальныя стужкі, здабываючы ўзнагароды на конкурсах і фестывалях (адна з апошніх, прэстыжная галоўная ўзнагарода VIII Міжнароднага фестывалю дакументальных фільмаў у французскай Ля-Рашэлі, атрыманая ўжо ў 2008 годзе за стужку "Галерэя Ады"). У канцы 80-х гадоў, узначальваючы здымачную групу "Беларусьфільма", ён наведвае шэраг школ і ліцэяў Беласточчыны, у якіх выкладаецца беларуская мова. Гэтая паездка прымушае Уладзіміра Коласа задумацца над пытаннем: а чаму ж у беларускай сталіцы няма сярэдніх школ, дзе так нязмушана і натуральна гучыць родная мова? І калі на пасяджэнні рады Савецкага раёна незадоўга перад тым створанага Таварыства беларускай мовы тагачасны кіраўнік рады Алег Трусаў ставіць пытанне: хто можа заняцца стварэннем у Мінску беларускага ліцэя, на гэта адгукаюцца не прысутныя на ім педагогі са стажам, а ён, Уладзімір Колас, які ўжо быццам бы памяняў ранейшую прафесію на "больш прэстыжную". Увесь 1990 год і пачатак 1991-га Уладзімір Колас ходзіць па чыноўніцкіх кабінетах не толькі ў Мінску, але і ў Маскве… Урэшце, ён знаходзіць падтрымку ў асобах тагачаснага новага міністра адукацыі Беларусі Міхаіла Дземчука і начальніка аддзела перспектыўнага развіцця таго самага міністэрства Аляксандра Казуліна. Вырашальным аказваецца спрыянне шэрагу дэпутатаў нававыбранага Вярхоўнага Савета БССР, Ніла Гілевіча, Алега Трусава, Станіслава Шушкевіча і інш., а таксама камісіі па адукацыі Мінгарсавета на чале з Вольгай Кузьміч.

Міністэрства адукацыі даручае Уладзіміру Коласу стварэнне Беларускага гуманітарнага адукацыйна-культурнага цэнтра (лістапад 1990 г.) і ліцэя пры ім (верасень 1991 г.). Апошняя ўстанова робіцца першым у сусветнай гісторыі ліцэем, у якім усе дысцыпліны выкладаюцца па-беларуску. З кожным годам беларускі гуманітарны ліцэй набірае аўтарытэту: конкурс на паступленне часам перавышае дзесяць чалавек на месца! Гэта не ўсім падабаецца ва ўладах, асабліва пачынаючы з сярэдзіны 90-х гадоў. Адміністрацыя прэзідэнта спрабуе забраць у Беларускага гуманітарнага адукацыйна-культурнага цэнтра яго будынак, што па вуліцы Кірава ў Мінску. Ліцэісты,

настаўнікі, іх бацькі вядуць змаганне на працягу ўсяго лета 1997 года, і, урэшце, ліцэй застаецца ў будынку. Наступнае лета (1998 год) зноў праходзіць у змаганні, бо ліцэй БГАКЦ спрабуюць далучыць да ліцэя БДУ. Урэшце, адукацыйна-культурны цэнтр улады ліквідуюць, але на яго месцы ствараюць Нацыянальны дзяржаўны гуманітарны ліцэй імя Якуба Коласа. Тагачасны віцэ-прэм’ер Уладзімір Замяталін зацвярджаць Уладзіміра Коласа дырэктарам гэтага ліцэя не хоча, але потым, пад ціскам грамадскасці і часткі чыноўнікаў, пагаджаецца зрабіць яго кіраўніком ліцэя, хоць фармальна пасада Уладзіміра Коласа з гэтага часу называецца “намеснік дырэктара”.

Новы наступ уладаў на Ліцэй пачынаецца ўвесну 2003 года. Калектыў ліцэя выказвае поўны давер свайму кі-раўніку (які, у міжчассе, на першым з’ездзе бела-рускай інтэлігенцыі быў выбраны старшынёй яе Рады).

Нягледзячы на гэта, 25 чэрвеня таго самага года, Савет міністраў прымае рашэн-не аб юрыдычнай ліквi-дацыі ліцэя на чале з Коласам. Тым разам пратэсты бацькоў, настаўнікаў, вучняў нікім не пачутыя…



*У Варшаве на падвядзенні вынікаў Беларусіяды*

Уладзімір Колас мае магчымасць заняцца іншай працай, але бацькоўская рада і абсалютная большасць выкладчыкаў заклікаюць яго не кідаць справы адзінага ў свеце ліцэя з беларускай мовай навучання. Колас бярэ ініцыятыву зноў у свае рукі і, з дапамогай калег, арганізоўвае навучанне дзяцей у неафіцыйным статусе. У гэты час ён займае пасаду кіраўніка творчай лабараторыі Таварыства беларускай школы “Еўрапейская школа – XXI стагоддзе”. На грамадскіх пачатках ён выконвае абавязкі старшыні Беларускага камітэта коледжаў міжнароднай супольнасці, уваходзіць у Рэспубліканскую Раду Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны, Раду Таварыства беларускай школы. Пры яго зычлівым спрыянні найлепшыя вучні і выпускнікі Беларускага гуманітарнага ліцэя і сярэдніх школ з розных гарадоў Беларусі паступаюць у прэстыжныя сярэднія і вышэйшыя навучальныя ўстановы ў розных краінах свету…

І сёння Уладзімір Колас лічыць, што адпачываць на лаўрах яму зарана. Ён плённа працягвае сваю педагагічную і мастацкую працу. У гэтай працы добрым апірышчам для яго ўвесь час былі і ёсць жонка Таццяна, а тасама сын Мікіта і дачка Вольга, самі колішнія выпускнікі гуманітарнага ліцэя. Хочацца верыць, што наперадзе ў спадара Уладзіміра – новыя педагагічныя, творчыя ўдачы.

Думаю, што да віншаванняў з нагоды юбілею Уладзіміра Коласа сёння далучацца сотні выпускнікоў Беларускага

гуманітарнага ліцэя, шматлікія педагогі, кінематаграфісты, мастакі, літаратары і проста сябры, якіх у яго ёсць нямала ў розных краінах свету. Ён гэтага, безумоўна, заслужыў: перадусім сваім цвёрдым чалавечым стрыжнем, а таксама сваім прафесіяналізмам і вельмі патрэбным у наш час аптымізмам.

**Лявон Баршчэўскі**

## Энгельсу Дарашэвічу – 70

Як вядома, людзі падзяляюцца на дзве вялікія групы: грамадска-актыўных і пасіўных. Апошнія электралізуюцца першымі і цягнуцца за імі. У ліку актыўных вылучаецца малая групоўка з высокім інтэлектуальным патэнцыялам, якая для большасці з'яўляецца маяком у тумане, што праменіць наваколле ведамі, мудрасцю, дабром, спагадай, надзеяй. І такім з'яўляецца ў айчыннай філасофіі прафесар Энгельс Дарашэвіч. Гэта ён разам з сябрамі пракладваў у нацыянальнай навуцы арыенціры пазнання і ўсведамлення.

Так, працуючы ўсё жыццё, што звязана з педагогікай, для мяне аўтарытэтным дарадчыкам і своеасаблівым люстэркам сталі кнігі па асвеце і педагагічнай думцы Беларусі, з якіх вабна і годна глядзеліся з мінуласці постаці мысляроў, настаўнікаў будучыні: Францыск Скарына, Лаўрэнцій Зізаній, Сімяон Полацкі, Ілля Капіевіч, Францішак Багушэвіч, Мікалай Нікіфароўскі, Цётка, Якуб Колас, Браніслаў Тарашкевіч, Сяргей Паўловіч…

Усцешна і тое, што Энегельс Дарашэвіч сёння ў поўнай моцы сваіх сіл прымае зацікаўлены і турботны ўдзел у грамадскім і навуковым жыцці краіны, выяўляючы высокія грамадзянскія пачуцці, досвед і сталасць.

**Алесь Лозка,**
фалькларыст

**Любоў ІЛЬЯСАВА,**
магістрантка БДПУ

# ІНТЭРАКТЫЎНЫЯ ЭЛЕМЕНТЫ Ў ДЗІЦЯЧЫХ ЭКСКУРСІЯХ

На сёнешні дзень існуе шматлікая колькасць разнастайных адукацыйных праграм для дзяцей. Кожны музей штосьці такое ды мае. А вось што датычыцца звычайнай экскурсіі, то яна як і была раней увасабленнем занудства, так і засталася такой. Яшчэ, як вядома, музеі не вельмі клапацяцца пра тое, каб прыцягнуць дзіцячую аўдыторыю да сябе, таму што ва ўсіх беларускіх школах існуе правіла абавязковага наведвання музея. Адсюль і фарміруецца памылковая думка: а навошта мы будзем нешта змяняць, ці паляпшаць, калі дзеці і так прыйдуць у музей? Нават дакладней не прыдуць, а іх прывядуць: настаўнікі ці выхавацелі. Так і атрымліваецца, што выкарыстоўваюцца яшчэ тыя праграмы, якія былі распрацаваны 20 ці 30 год таму. І гэта, як правіла, маналог экскурсавода ці навуковага супрацоўніка, у якім, у лепшым выпадку, трапляюцца пытанні кшталту: знайдзіце 10 адрозненняў, хто запомніў як называлася, ці калі было, і г.д. А неабходная для дзяцей інтэрактыўнасць амаль адсутнічае. Канешне, трэба абмовіцца, што не ўсё так сумна, і ёсць пэўная колькасць спецыялізаваных праграм, у якіх дзеці нават штосьці робяць сваімі рукамі. Але такіх праграм ня шмат, і яны ёсць далёка не ў кожным музеі, больш таго, не кожным музеі ёсць для гэтага

адпаведныя памяшканні. Тады паўстае пытанне: а што ж рабіць? На самой справе, ёсць пэўная колькасць простых інтэрактыўных элеменатаў, якія кожны экскурсавод можна ўключыць у сваю экскурсію, зрабіўшы, тым самым, яе больш эфектыўнай і цікавай для дзіцячага ўспрымання.

Такім чынам, паспрабуем зрабіць свайго роду партфель экскурсавода для дзіцячай экскурсіі. І першым прадметам у ім будзе памятка для самаго экскурсавода: *З двух магчымых слоў, заўсёды выбірай самае простае.* Далей, каб было больш наглядна, зробім такі партфель на прыкладзе звычайнай агляднай экскурсіі па сектары Цэнтральная Беларусь Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту. Лепш за ўсё будзе, калі экскурсавод сустрэне дзяцей ужо апрынутым у народны строй. Гэты невялікі фактар прыцягне ўвагу малых гасцей, і яны будуць больш зацікаўлены падчас экскурсіі. Потым, на пачатку экскурсіі, калі ідзе знаёмства з гіторыяй скансэнаў, нам спатрэбяцца «Стужкі часу». Яны дапамогуць дзецям, асабліва малодшага школьнага ўзросту, лепш з'арыентавацца ў гістарычнай прасторы. Імі могуць быць шнурочкі з вузелкамі, ці невялікія паперкі з указаннем стагоддзяў, на якіх наведвальнікі падчас экскурсіі могуць рабіць адпаведныя адзнакі.

Першым з помнікаў, з якім знаёмяцца экскурсанты, з'яўляцца царква з в. Логнавічы. Тут можна прапанаваць маленькім экскурсантам раз меркаваць на адпаведным макеце іканастаса іконы ў тым парадку, у якім ім падаецца правільна. Ці, як варыянт, раздаць надрукаваны план, ці малюнак царквы і папрасіць іх падпісаць як можна больш элементаў, якія яны ведаюць. Пасля чаго, запоўніць разам астатнія.

У школе з в. Калодчына дзяцей можна рассадзіць на лавы, і прапанаваць задачку са зборніка па матэматыцы канца 19 ст. Той, хто першы знойдзе рашэнне — атрымлівае маленькі прыз.

Свіран — выдатнае месца, каб адчуць сябе вясковым старастай, і паспрабаваць адзначыць на дошцы, хто колькі асьмін зерня прынёс.

Нарэшце дабраліся і да першай сядзібы. Тут ужо сапраўднае раздолле для розных гульняў і забаў. І перш чым, распачаць распавядаць пра ўнутранае ўбранства хаты, можна згуляць у гульню: «адгадаеце, для чаго», пад час якой запытаць пра найбольш цікавыя прадметы.

У сядзібе з в. Агароднікі, калі ідзе размова пра лён і яго апрацоўку, можна даць паспрабаваць спрасці невялікі кавалак кудзелі. Ці патрапаць лён.

Наступная хата з в. Садавічы, прадстаўляе традыцыйны інтэр'ер на Каляды. Тут можна і песьні паўспамінаць і варажбу.

У апошняй сядзібе з в.Зброддзе, велімі добра правесці падагульняючую віктарыну, ці гульню. Напрыклад, можна папрасіць дзяцей, каб яны выбралі які-небудзь прадмет, які ім больш за ўсё спадабаўся, а потым, апісваючы яго функцыі, ці выгляд загадаць астатнім. Ці можна пагуляць у «Кракадзіла», калі адзін паказвае прадмет, а астатнія адгадваюць. Хто першы адгадаў, паказвае далей.

На выставе «Забродскія снасці», прысвечанай рыбалоўству на Беларусі, можна зрабіць невялікую віктарыну, а пераможца можа атрымаць у якасьці прыза невялікую цацачную рыбку. Потым, можна запытацца, ці мае хто ўжо вопыт у гэтай справе, можа хто дапамагаў бацьку рыбу лавіць. Яшчэ адным з відаў атракцыі можа стаць гульня ў лоўлю рыбы. Для яе правядзення спатрэбіцца вудзіла з магнітам і сувенірныя рыбкі. Таксама можна паспрабаваць самім вязаць сеці. А для самых маленькіх прапануецца спецыяльны акварыум з печывам у выглядзе рыбак, і адпаведна невялікая сетка, каб дзеці маглі вылавіць сабе крыху.

Акрамя ўсяго вышэй апісанага, можна таксама выкарыстоўваць розныя «Чароўныя скруткі», ці копіі гістарычных дакументаў, афармленыя ў адпаведным

стылі, ці проста надрукаваныя на паперы, якую потым можна вымачыць у гарбаце, каб яна атрымала крыху пажаўцелы выгляд.

Безумоўна, гэта зусім не азначае, што патрэбна ўсе гэтыя элементы выкарытоўваць у адной экскурсіі. Тут нават 2-3 элементы ўжо значна падымуць узровень і якасць экскурсіі. А калі іх чаргаваць, гэта зробіць кожную экскурсію своеасаблівай і непаўторнай, а таксама ў дзяцей з'явіцца інтарэс наведаць музей зноў.

## МАРК БРУГЕМАН ГАВОРЫЦЬ ПА-БЕЛАРУСКУ

Даешся толькі дзіву: наш тутэйшы чыноўнік, што жыве на



беларускай зямлі і карку народа, не ведае і не хоча ведаць яго мову. Нібы за 30-40 гадоў не можна вывучыць беларускую. Хоць ужо вядомы дзесяткі прыкладаў, калі людзі з розных краін авалодвалі нашай мовай нават за кароткі перыяд.

Вось і нядаўна праз інтэрнет да мяне звяр-нуўся з просьбай адзін аспірант з нямецкага горада Ольдэнбург, што блізу Брэмена, каб яму пасадзейнічаць у патрэбных сус-трэчах пад час яго прыезду ў Мінск у верасні. 36-гадовы аспірант яшчэ супрацоўнічае з інтэрнет-парталам «Café Babel» (www.cafebabel.de). Mark Brüggeman вучыўся ў тутэйшым універсітэце, здабываючы веды па палі-талогіі і славянскай філалогіі. Прыехаўшы аднойчы ў Беларусь на пачатку перабу-довы, быў так здзіўлены сітуа-цыяй з нашай мо-вай, што вырашыў яе даследаваць у аспірантуры. Док-тарская дысертацыя пра моўны дыскурс у Беларусі ўжо напісана і захацелася яшчэ раз наведаць так знаёмыя і родныя мясціны ў неафі-цыйным парадку. А афіцыйна ён праходзіў гадавую стажыроўку ў БДУ, у дактаранта Сяргея Запрудскага (моваведа).

Памятаецц а выпадкова заглянулі мы ў адну вялікую ўніверсі-тэцкую аўдыторыю, дзе вучацца за свае грошы пад навязанай ідэалогіяй на мове суседняга брацкага народа. Пытаюся, можа хто-небудзь ведае нямец-кую, каб задаць пытанне нямецкаму госцю. Цішыня. А Марк ды і гаворыць: «То я буду прамаўляць па-беларуску, бо я гэтую мову вельмі люблю». Мора здзіўленых і ўсхваляваных воплескаў… А адна студэнтка сумелася па-беларуску, што іх не задавальняе ўсё-такі моўная сітуацыя ў краіне.

З намі яшчэ быў адзін навучэнец зачыненага ў нас Гуманітарнага ліцэя. Яго бацька вымушаны быў зволіцца з

дзяржаўнай сярэдняй установы нашай сталіцы, бо выяўляў беларускасць. А сыну, каб вучыцца па-беларуску, давялося разам з сябрамі вучыцца ў недзяржаўным ліцэі ў Гданьску (Польшча). І гэта яму не перашкодзіла вывучаць некалькі еўрапейскіх моў, кампутар, з якім хлопец звязвае сваю будучыню, і спяваць фінскія песні пад гітару, на якой вучыцца музыцыраваць.

Свае думкі аб моўнай сітуацыі і новых знаёмствах у Беларусі Марк выклаў на старонках партала.

*На здымках:* на сустрэчы з навучэнцамі і выпускнікамі зачыненага ліцэя ў Мінску і адчыненага ў Гданьску; выдатнік адукацыі СССР, БССР, РСФСР, дырэктар сталічнай беларускай гімназіі Юры Бан-дарэнка, мастак Фелікс Янушкевіч, Марк Бругеман і Алесь Лозка.

## НА КАЛЯРОВАЙ ВОКЛАДЦЫ



І.1 Студэнты спецыяльнасцей “Сусветная і айчынная культура. Фальклор” і “Сусветная і айчынная культура. Рытміка. Харэаграфія” на фальклорна-этнаграфічнай практыцы ў вёсцы Лобча Лунінецкага раёна. Сапраўдны знаўца палескага фальклору Анастасія Якавец.

І.2 Нілу Гілевічу – 80.

І.3 Група ўдзельнікаў Асамблеі ТБШ і Нацыянальнай канферэнцыі.

ІІ.1 У Беларускай нацыянальнай гімназіі №4; выдатнік адукацыі СССР, БССР, РСФСР, дырэктар Юры Бандарэнка, мастак Фелікс Янушкевіч, Марк Бругеман і Алесь Лозка.

ІІ.2 Выступае фальклорны ансамбль БДПУ “Квецень”.

ІІ.3 На падвядзенні вынікаў конкурса метадычных матэрыялаў “Адукацыя для свабоды”.

ІІ.4 Фотаэцюд “Хлопчык і голуб”.

ІІ.5 На занятках па традыцыйнаму тэатру (факультэт эстэтычнай адукацыі БДПУ).

ІІІ.1 Студэнцкае лета. Лунінец.

ІІІ.2 Выдатны майстар разьбы па дрэву з Жыткавіцкага раёна Аляксандр Масло ў прыватнай сядзібе “Заблуканы рай”. Гэта ён афармляў сядзібу Дзеда Мароза ў Белавежскай пушчы і інш.

ІІІ.3 Беларусы ў музеі юрскага перыяду (Польшча, г. Лэба).

ІІІ.4 Кафедра этналогіі і фалькларыстыкі БДПУ (загадчык Васілевіч У.А).

ІV.1 Сумесная вечарына навучэнцаў і выкладчыкаў беларускага ліцэя ў Гданьску і грамадскасці польскага горада.

ІV.2 Выступаюць ліцэісты.

ІV.3 Уладзіміру Коласу – 60. Уручэнне медаля ганаровага грамадзяніна горада (Францыя) дырэктару зачыненага ліцэя.

ІV.4 – 5 Ліцэісты з Беларусі навучаюцца ў падарожжах па Польшчы.

**«Летапіс ТБШ». 2011. № 2 (25).**
**Выданне Рэспубліканскага грамадскага аб’яднання «Таварыства беларускай школы».**
З 1999 па 2004 г. – «Бюлетэнь ТБШ», выйшла 8 нумароў. З 2005 г. – «Летапіс ТБШ».
Новая рэдакцыя Статута ТБШ зарэгістравана Міністэрствам юстыцыі 26.10.2006 г.
№ 333 у Адзіным дзяржаўным рэгістры юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў № 101850405. Пасведчанне аб рэгістрацыі № 01635.
**Адрас Канцылярыі ТБШ: 220039 Мінск, вул. Варанянскага, 7А, п.720.**
**Тэл. рэдактара – 017- 2740472 (т/факс), 029- 7785698. E-mail: tbskoly@tut.by; lozkaa@gmail.com. Здадзена ў друк 30.09. 2011 г. Наклад 299 асобнікаў.**
***Рэдактар Алесь ЛОЗКА***